ЧЭРВЕНЬ
5
СЕРАДА
1940 год
№ 16 (472).
ЦАНА 20 КАП.

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН
ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА
СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ
БССР
І УПРАЎЛЕННЯ ПА
СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ
ПРЫ СНК БССР

Няхай жыве ленінска-сталінская нацыянальная палітыка!

* * *

СВЯТА БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ

5 чэрвеня ў Маскве пачынаецца дэкада беларускага мастацтва. Беларускі народ прадэманстрыруе перад мудрым Сталіным, совецкім урадам і вялікім рускім народам свае дасягненні ў галіне мастацтва, нацыянальнага па форме і соцыялістычнага па свайму зместу.

Беларускі народ у выніку паслядоўнага правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, штодзённых клопатаў і кіраўніцтва асабіста таварыша Сталіна дабіўся росквіту свайго совецкага мастацтва.

Вызвалены Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыяй, геніямі Леніна і Сталіна, працавіты беларускі народ вылучыў са свайго асяроддзя дзесяткі тысяч талентаў, якія з поспехам працуюць ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі, навукі і тэхнікі, літаратуры і мастацтва.

Сагрэтая клопатамі Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі соцыялістычная інтэлігенцыя, акторы, мастакі, кампазітары і літаратары Беларускай ССР аддана і шчыра працуюць на карысць свайго народа, ствараючы новую культуру. Працаўнікі літаратуры і мастацтва Беларускай ССР, як і ўся соцыялістычная інтэлігенцыя Совецкага Саюза, згуртаваны навакол Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, навакол правадыра народаў СССР Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна, прадаўжальніка вялікай справы Маркса—Энгельса—Леніна.

Магутны рускі народ на працягу ўсёй гісторыі дапамагаў і дапамагае свайму сабрату — беларускаму народу ў будаўніцтве эканомікі і культуры. Асабліва эфектыўную дапамогу Беларусі аказаў рускі народ пасля соцыялістычнай рэволюцыі ў Расіі, дапамогшы ператварыць нашу краіну, якая раней у эканамічных і культурных адносінах была адсталай, у адну з перадавых, квітнеючых рэспублік.

Працаўнікі мастацтва Беларускай ССР, выконваючы ўказанні В. І. Леніна аб выкарыстанні ўсяго лепшага, створанага чалавецтвам у мінулым, вучыліся і вучацца на лепшых узорах рускай класікі ў літаратуры і мастацтве, на ўзорах сучаснай братняй рускай культуры.

Следуючы прыкладу геніяльнага рускага пісьменніка А. М. Горкага, які яшчэ ў 1911 годзе заўважыў выдатных беларускіх пісьменнікаў Янку Купалу і Якуба Коласа, пераклаў іх паасобныя творы на рускую мову і ўвесь час клапаціўся аб іх творчым росце, старэйшыя і найбольш кваліфіцыраваныя майстры совецкага мастацтва рускай сцэны, як А. Ермалаеў, К. Галейзоўскі, П. Златагораў, І. Шлепянаў, І. Раеўскі, сваёй практычнай работай значна дапамаглі росту беларускага совецкага мастацтва. Вялікую паслугу аказалі кансультанты А. Нежданава, Н. Галаванаў, М. Леанідаў, а таксама мастакі Юон, Мадораў, Лехт і іншыя, якія прынялі ўдзел у падрыхтоўцы дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. За гэта беларускі народ вельмі ўдзячан і ніколі гэтага не забудзе.

Як ні стараліся беларускія контррэволюцыйныя нацыянал-дэмакраты, трацкісты і бухарынцы адарваць Беларускую ССР ад Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, з'арыентыраваць развіццё беларускай культуры на буржуазны Захад, ім гэтага не ўдалося і ніколі не ўдасца зрабіць. Беларускі народ, кіруемы партыяй Леніна—Сталіна, на-галаву разбіў гэтых прадажных сабак, заклятых ворагаў народа. Народныя масы Беларусі заўсёды цягнуліся і цягнуцца да Масквы, да братняй вялікай рускай культуры.

Воляй совецкага ўрада, народаў СССР, вялікага Сталіна гераічная Чырвоная Армія вызваліла народы Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ад нянавісных польскіх памешчыкаў і капіталістаў. Цяпер вялікі беларускі народ навекі з'еднан у адну сям'ю. Яму не страшны ніякія выпрабаванні. Сцэментыраваны мудрай партыяй Леніна—Сталіна, ён здолее абараніць заходнія рубяжы Совецкага Саюза ад усіх тых, хто, страціўшы розум, памкне на нашу свяшчэнную соцыялістычную зямлю, пакваліцца на нашы багацці.

За нябачана кароткі тэрмін беларускі народ стварыў мастацтва, якое сваімі карэннямі ўваходзіць у самыя шырокія народныя масы, дапамагаючы ім будаваць новае комуністычнае грамадства; вырасціў цэлую плеяду маладых таленавітых артыстаў, якія кроўна звязаны са сваім народам і працуюць на яго карысць. У народзе шырока вядомы такія майстры беларускага совецкага мастацтва, як народныя артысты Беларускай ССР Л. Александроўская, Г. Глебаў, А. Ільінскі, В. Уладамірскі і Е. Міровіч, як дзесяткі заслужаных артыстаў і заслужаных дзеячоў мастацтваў, сотні маладых таленавітых актораў, мастакоў, кампазітараў, якія з поспехам працуюць у галіне мастацтва.

Характэрнай асаблівасцю беларускага совецкага мастацтва з'яўляецца яго жыццерадаснасць, аптымізм, вера ў перамогу вялікай справы Леніна—Сталіна, рэалізм, з'яўляецца тое, што ў яго аснову закладзена багатая народная творчасць, што маладыя беларускія акторы, мастакі, кампазітары вучацца ў лепшых майстроў лепшага ў свеце рускага мастацтва.

Беларускі тэатр оперы і балета пакажа ў Маскве оперу «Міхась Падгорны» Е. Цікоцкага (лібрэта П. Броўкі), «У пушчах Палесся» А. Багатырова (лібрэта Е. Рамановіча па аповесці Якуба Коласа), «Кветка шчасця» А. Туранкова (лібрэта О. Барысевіч, П. Броўкі і П. Глебкі), балет «Салавей» М. Крошнера (лібрэта М. Сланімскага і А. Ермалаева па аповесці Змітрака Бядулі).

Беларускі Мінскі драматычны тэатр пакажа на дэкадзе «Партызаны» і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Пагібель воўка» Эд. Самуйлёнка і «Апошнія» М. Горкага.

Сіламі Беларускай Дзяржаўнай філармоніі, Тэатра оперы і балета і мастацкай самадзейнасці будзе дадзен заключны канцэрт.

Выключна важную ролю ў падрыхтоўцы да дэкады ў Маскве адыгралі літаратары Беларускай ССР, якія напісалі п'есы, песні, лібрэта опер, гэтым самым дапамаглі падняць беларускае совецкае мастацтва на вышэйшую ступень. Творчае садружжаства паміж пісьменнікамі і працаўнікамі мастацтва неабходна будзе ўсямерна пашырыць, гэта дапаможа нашай агульнай справе — далейшаму росту беларускага совецкага мастацтва.

Велізарнейшых поспехаў дасягнула беларуская совецкая літаратура. Совецкі ўрад па заслугах ацаніў лепшых літаратараў Беларускай ССР, узнагародзіўшы ордэнамі СССР т.т. Янку Купалу, Якуба Коласа, Змітрака Бядулю, Міхася Лынькова, Пятруся Броўку, Пятра Глебку і Эдуарда Самуйлёнка, якія сваімі творамі ўзбагацілі не толькі беларускую совецкую, але і саюзную літаратуру.

У сувязі з падрыхтоўкай да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве выраслі не толькі калектывы, якія выступяць у Маскве, — вырасла ўсё мастацтва Беларускай ССР. Мы па праву можам сказаць, што мастацтва Совецкай Беларусі, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі, дасягнула спеласці і росквіту.

На сцэне беларускага тэатра глядач убачыў любімых усімі народамі СССР і працоўнымі ўсяго свету Леніна і Сталіна, вобразы якіх паказалі маладыя беларускія акторы П. Малчанаў і А. Ільінскі, вобраз Серго Орджанікідзе, ролю якога выконвае Н. Звездачотаў. Усе нашы лепшыя мастакі працавалі і працуюць над стварэннем у выяўленчым мастацтве вобразаў геніяў соцыялістычнай рэволюцыі Леніна і Сталіна, іх бліжэйшых саратнікаў.

Спеласць і росквіт беларускага совецкага мастацтва з'яўляецца трыумфам мудрай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Цяпер мастацтва Беларускай ССР уступае ў найбольш адказны і найбольш складаны перыяд свайго развіцця. На ўвесь рост паўстае пытанне стварэння класічнага совецкага мастацтва, якое данесла-б у вякі гераіку соцыялістычнага будаўніцтва, барацьбу рабочага класа, сялянства і інтэлігенцыі за пабудову комуністычнага грамадства, кіруючую ролю ў гэтым нашай мудрай партыі Леніна — Сталіна. Гэту гістарычнай важнасці задачу працаўнікі мастацтва Беларускай ССР здолеюць вырашыць пры ўмове, калі яны не зазнаюцца пасля першых вялікіх перамог, калі яны і ў далейшай сваёй творчай рабоце будуць асноўвацца на лепшых узорах народнай творчасці, будуць вучыцца на ўзорах рускай і сусветнай класікі, настойліва будуць працаваць над авалоданнем марксізмам-ленінізмам.

Вялікая роля належыць мастацтву ў справе комуністычнага выхавання падрастаючых пакаленняў. Нашай моладзі неабходна паказаць гераіку барацьбы беларускага народа супроць вялікай колькасці ўсялякіх прыгнятальнікаў. Таленавіты беларускі народ, не гледзячы на жорсткую барацьбу, катаванні і здзекі, пранёс праз вякі сваю мову, культуру, аптымізм і пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі дабіўся разняволення, назаўсёды скінуў ланцугі рабства і пакуты.

Задачай нашага мастацтва і яго тварцоў з'яўляецца дапамагчы працоўным заходніх абласцей БССР у найкарацейшы тэрмін падняць сваё мастацтва і культуру да ўзроўню мастацтва і культуры ўсходніх абласцей БССР.

Перад мастацтвам Совецкай Беларусі стаіць задача працаваць і надалей над паказам народу ва ўсёй іх велічы геніяў соцыялістычнай рэволюцыі Леніна і Сталіна і іх саратнікаў, якія аддалі ўсё сваё жыццё на карысць працоўнага народа.

Працаўнікам мастацтва Совецкай Беларусі нельга ні на адну мінуту забываць, што перадышка скончана. Магчымы ўсялякія нечаканасці. Мы павінны заўсёды быць напагатове, у стане мабілізацыйнай гатоўнасці, каб сродкамі мастацтва, а калі трэба будзе—і вінтоўкай разіць ворага, бараніць сваю любімую радзіму-маці.

Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве — свята беларускай культуры.

Няхай жыве мудрая ленінска-сталінская нацыянальная палітыка!

Слава таварышу Сталіну!

*

П. БРОЎКА

СЛАВА МАСКВЕ

Чырванеюць зоры над Масква-ракою,
Навакол спявае родная зямля.
Добры дзень, радзімы сэрца агнявое,
Добры дзень, вам, вежы слаўнага
Крэмля.
Слаўны горад Масква!
У прыгожы наш час
Тваім зорам гарэць, разгарацца!
Калыхала ты нас,
Гадавала ты нас,
Ты—Масква, наша родная маці.
На палях шырокіх нашай Беларусі,
Па усёй радзіме чуцен голас твой,—
Ад снягоў паўночы да вышынь
Эльбруса
Сходзяцца народы раіцца з табой.
Слаўны горад Масква!
У прыгожы наш час
Тваім зорам гарэць, разгарацца!
Калыхала ты нас,
Гадавала ты нас,
Ты—Масква, наша родная маці!
У часы работы і ў часы начныя
Мы з табой заўсёды шчыраю душой,
І палі са збожжам і бары густыя
Да цябе хінуцца ветла галавой.
Слаўны горад Масква!
У прыгожы наш час
Тваім зорам гарэць, разгарацца!
Калыхала ты нас,
Гадавала ты нас,
Ты—Масква, наша родная маці!
Мы надзейнай вартай на граніцы сталі,
Не парушыць ворак наш жаданы мір,—
Бо Масква за намі, бо над намі
Сталін,
Бацька наш любімы, мудры правадыр.
Слаўны горад Масква!
У прыгожы наш час
Тваім зорам гарэць, разгарацца!
Калыхала ты нас,
Гадавала ты нас,
Ты—Масква, наша родная маці!

А. ЖАЎРУК

МАСКВА

Москва... как много в этом звуке...
Пушкин.

Цудоўны ранак. Маладая
Шуміць над рэчкай асака.
Стары Батоўкін запрагае —
На ўсю акругу — рысака.

К поўстанку з ім поўвёскі едзе, —
Грукочуць колы па мастку.
— У добры час! Куды, суседзі?
— У Маскву!
На сесію ў Маскву!

А даль блакітам запалала.
Цвітуць ільны.
Мінае час.
І вось кудзеляй небывалай,
Глядзіш, праславіўся калгас.

К поўстанку зноў поўвёскі едзе, —
Грукочуць колы па мастку.
— У добры час! Куды, суседзі?
— У Маскву!
На выстаўку ў Маскву!

З удачай скрозь і песня дружыць.
Грымяць цымбалы. Бубны б'юць.
Лявоніха. Дзяўчаты кружаць.
Хлапцы у прысядкі ідуць...

Прышла машына. Крыкі. Зборы.
Грукочуць колы па мастку.
— Куды? — пытаюся ў шафёра.
— Ды на дэкаду мы! У Маскву!

І так заўжды:
З далін мурожных,
І з юрт,
І з гор, спавітых ў дым, —
Мы з кожнай радасцю
і з кожным
Вялікім клопатам, малым —
З усім, чым рады і багаты,
(Так к сонцу цягнецца трава!)
За шчырым словам,
за парадай
Ідзем к табе,
К табе, Масква.

А. РУСАК

Чырвонае сонца

Над краем ты ўстала,
Дзе ноч векавала,
Над краем жабрачым,
Чырвонае сонца.

І краты спаліла,
Жыццё асвяціла
Ты роднаму брату,
Чырвонае сонца.

Вялікае мора
І здзеку, і гора
Там, дзе ты не свеціш,
Чырвонае сонца.

І звонка спявае
Там радасць людская,
Дзе зззяе твой промень,
Чырвонае сонца.

Надыйдзе дзень новы,
Як цемру й аковы
На ўсёй зямлі спаліш,
Чырвонае сонца.

І вогненным светам
Над цэлым сусветам
Навек загарышся,
Чырвонае сонца.



Апраўдаем давер'е народа

Ад выканання прымітыўнай беларускай народнай песенькі пад скромны акампанімент цымбалаў да стварэння такіх манументальных твораў совецкага мастацтва, як оперы «Міхась Падгорны», «У пушчах Палесся», «Кветка шчасця», балет «Салавей», — такі шлях нашай творчай працы за 20 год.

Сюжэтамі твораў, якія мы пакажам у Маскве, паслужылі гераічныя старонкі гісторыі беларускага народа — ці то з часоў прыгонніцтва, ці з часоў барацьбы з акупантамі альбо барацьбы з унутраным ворагам — кулацтвам; усюды чырвонай ніццю праходзіць гераізм народа, яго барацьба за сваю свабоду, за сваё шчаслівае раднасае жыццё, якога ён дасягнуў пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

На нашу долю выпала вялікае шчасце паказаць жыццё беларускага народа ў Маскве перад лепшымі людзьмі нашай краіны, перад тымі, каму беларускі народ абавязан сваім прыгожым сёння. Увесь наш калектыў, кожны з яго ўдзельнікаў гарыць жаданнем выступіць як мага лепш, апраўдаць давер'е народа, апраўдаць велізарныя клопаты аб нас партыі і ўрада, нічога не шкадуючы для поспеху соцыялістычнага мастацтва.

Я памятаю адзін выпадак, калі я ўпершыню выступала ў Калоннай зале Дома саюзаў у Маскве ў адказным канцэрце на Пушкінскім пленуме Саюза пісьменнікаў. Вышаўшы на эстраду, я ўбачыла групу пісьменнікаў БССР і адчула, што яны ўсе перажываюць маё хваляванне. Я адчула ў гэтым такое вялікае падтрыманне, што ў мяне знікла нясмеласць і засталося толькі гарачае жаданне спяваць так, каб Беларусі не было сорамна перад прадстаўнікамі братніх рэспублік. Канцэрт прайшоў удала.

І цяпер, выязджаючы ў Маскву, мы адчуваем, як увесь беларускі народ, пасылаючы нас паказваць росквіт мастацтваў БССР перад таварышам Сталіным, — хвалюецца, перажывае разам з намі, гарыць адным агульным жаданнем, каб мы здалі гэты экзамен на «выдатна». І гэта пачуццё надае нам яшчэ больш сілы, напаўняе нас яшчэ большым жаданнем выканаць даручэнне беларускага народа. Хочацца заверыць беларускі народ, што мы, адчуваючы ўсю нашу адказнасць, прыкладзём усе сілы, каб апраўдаць давер'е народа, апраўдаць любоў і клопаты аб нас.

Л. П. АЛЕКСАНДРОЎСКАЯ.
Народная артыстка БССР.

Удзячны партыі за клопаты аб мастацтве

Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве — велізарная падзея ў жыцці ўсіх работнікаў мастацтваў ордэнаноснай Совецкай Беларусі. Яна з'явіцца аглядам нябачанага росквіту мастацтваў з'еднанага беларускага народа, у тым ліку і музычнага. Як указваў у сваім дакладзе XVIII з'езду КП(б)Б тав. Панэмарэнка, опера і балет створаны ў БССР за апошнія 2—3 годы. Дзякуючы клопатам партыі і ўрада, мастакі, пісьменнікі, кампазітары БССР стварылі за гэтыя гады рад буйнейшых твораў ва ўсіх галінах мастацтва.

З велізарным творчым уздымам рыхтаваліся ўсе работнікі мастацтваў БССР да сваёй дэкады і зараз са зразумелым хваляваннем і раднасай нецярплівасцю чакаюць яе пачатку. Масквічы на нашай дэкадзе ў выкананні калектываў Опернага тэатра, Мінскага драматычнага, Філармоніі, самадзейнасці (у тым ліку з заходніх абласцей рэспублікі, а таксама калгаснай і чырвонаармейскай) пачуюць і ўбачаць тры арыгінальных беларускіх оперы, беларускі балет, тры драматычных спектаклі беларускіх аўтараў і адзін горкаўскі, рад выдатных песень і плясак беларускага народа, сімфанічныя і камерныя творы беларускіх кампазітараў, а на выстаўцы выяўленчага мастацтва пазнаёмяцца з лепшымі ўзорамі работы нашых мастакоў і скульптараў.

Усе мы, работнікі мастацтваў, пачынаючы ад аўтараў спектакляў, пастаноўшчыкаў, дырыжораў, актораў і канчаючы рабочымі сцэны, з радасцю і творчым энтузіязмам пакажам мастацтва гераічнага беларускага народа працоўным Масквы і тварцу нашай дзяржаўнасці, лепшаму другу і настаўніку беларускага мастацтва і культуры — вялікаму Сталіну.

Е. ЦІКОЦКІ.
Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР.

Створым совецкую класіку

Прышоў я ў першы Дзяржаўны беларускі драматычны тэатр у 1924 годзе. Да гэтага часу я працаваў у трупах пры часцях Чырвонай Арміі. У Беларускі тэатр я прышоў ужо прафесіянальным акторам. Тэатр я любіў і люблю, як жыццё. Для мяне нямысліма радасць і шчасце без тэатра.

За 16 год работы ў Беларускім тэатры я сыграў каля 40 самых рознастайных ролей. З вялікім захапленнем і творчым хваляваннем працаваў я над ролямі: Дзям'яна Абабуркі ў п'есе Э. Самуйлёнка «Пагібель воўка», Івана Каламійцава ў п'есе М. Горкага «Апошнія», Данілы Дрыля ў п'есе К. Крапівы «Партызаны». З выкананнем гэтых ролей я выступлю ў роднай Маскве ў часе дэкады беларускага мастацтва. Гэта вялікі гонар для мяне. Я не раз марыў аб тым, каб паказаць сваю работу ў Маскве перад партыяй і ўрадам, перад вялікім Сталіным. Я зайздросціў акторам, якія выступалі ў Маскве і работу якіх праглядаў і ацэньваў таварыш Сталін. І мара мая здзейснілася. Я выступаю ў Маскве.

Дэкада беларускага мастацтва ў Маскве — гэта творчы рапарт маёй шчаслівай Беларусі, рапарт усяго фронта мастацтваў маёй рэспублікі.

Я шчаслівы, што буду ў Маскве выконваць тыя ролі, якія мне больш падабаюцца, над якімі я доўга і настойліва працаваў. Я запэўняю беларускі народ, работнікаў мастацтваў, урад БССР, што прыкладу ўсе сілы, каб апраўдаць аказаны мне гонар і вялікае давер'е.

Пасля дэкады я і мае таварышы будзем працаваць яшчэ з большай энергіяй з тым, каб падняць беларускае мастацтва на вышэйшую ступень, каб стварыць совецкую класіку.

В. УЛАДАМІРСКІ
Народны артыст БССР.

Пад сцягам Леніна-Сталіна да новых творчых перамог!

ВЫДАТНЫ ТВОРЧЫ КАЛЕКТЫЎ

★ ★ ★

М. Модэль

У вясновы майскі дзень кур'ерскі поезд паімчаў у Маскву вялікую групу пасвяточнаму апранутых, з прыўзнятым настроем пасажыраў. Гэта былі музыканты, спевакі, танцоры, артысты Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, якія паехалі па даручэнню беларускага народа ў сталіцу нашай радзімы Маскву.

Мэта іх незвычайнай паездкі — паказаць праводным сталіцы, роднаму Сталіну расквітнеўшае беларускае оперна-балетнае мастацтва, расказаць аб ажыццёўленых марах.

Сонца Сталінскай Канстытуцыі асвяціла і сагрэла ўсё жыццё беларускага народа. Пад гэтым пудадзейсным сонцам закрасавала і наша мастацтва.

Спробы напісаць беларускую оперу рабіліся даўно. Кампазітары Манюшка і Кімант стварылі на тэксты Дуніна-Марцінкевіча оперы «Сялянка» і «Залёты». Аднак, напісаныя ў форме нямецкіх зінгшпіляў XVIII стагоддзя з чаргаваннем простых вакальных нумароў і дыялагаў, яны не былі поўнацэннымі музычна-драматычнымі творамі.

Толькі ў 1936 — 1940 г. г. напісаны і пастаўлены беларускія оперы «Міхась Падгорны», «Кветка шчасця», «У пушчах Палесся», балет «Салавей». Напісана і рыхтуецца да пастаноўкі опера «Кацярына».

Высокі ідэйна-мастацкі ўзровень першых беларускіх савецкіх опер знайшоў дастойную ацэнку ў цэнтральным друку.

Высокай ацэнкі заслугоўваюць опера «Кветка шчасця», музыка якой светлая і празрыстая, глыбока народная па свайму духу, а таксама балетны спектакль «Салавей», у якім ва ўсёй сіле загучаў велізарны самабытны талент маладога балетмайстра А. Н. Ермалаева і першага балетнага кампазітара ў БССР М. Крошнера.

Беларускія оперы і балет з'явіліся багацейшай школай вакальнага, танцавальнага і сцэнічнага майстэрства для нашых актораў.

Наўрад ці можна знайсці больш чароўную і таленавітую выканальніцу партыі Марысі ў «Міхасю Падгорным», чым народная артыстка рэспублікі Л. П. Александроўская.

У цудоўнай ігры Александроўскай і яе пранікнёна-драматычным спяванні надзвычайная глыбіня, лірычнае абаянне, народная задушэўнасць паэзіі П. Броўкі і хвалюючай музыкі Е. Цікоцкага. Александроўская — Марыся апавядае аб пакутах жанчыны, якая перажывае глыбокі душэўны канфлікт: барацьбу пачуцця любві да Міхася з рэлігійным абавязкам перад Зміцерам. Трагічны канфлікт, нясьбітам якога з'яўляецца Марыся, нагадвае канфлікт Кацярыны («Гроза» Астроўскага), але Марыся—новая Кацярына, беларуская, якая дзейнічае ў часе наспявання буйных рэвалюцыйных падзей, і таму лёс Марысі процілеглы лёсу Кацярыны. Опера «Міхась Падгорны» па глыбіні мыслі і музычнай драматургіі ў галіне опэн і шырока ўзнімаецца да філасофскага абагульнення. Гэта ў першую чаргу можна сказаць пра найбольш удалы вобраз оперы — вобраз Марысі.

Філасофія партыі Марысі раскрыта ва ўсім яе багацці ў вобразе, створаным Александроўскай. Марыся — Александроўская—выразніца народных дум, імкненняў, гора і радасці, вясёласці і суму.

Чароўная жаночасць і адухоўленасць Александроўскай, сіла яе прыгожага і цёплага па тэмбру голасу асабліва адчувальны ў арыі Марысі з другога акта. Якая гама чалавечых эмоцый у гэтай цудоўнай арыі!

Александроўская раскрыла ўсю прыгажосць душы беларускай жанчыны, яе чалавечую гордасць, свежасць і чыстату яе пачуцця.

Светлым вясенім пачуццём напаўняе Л. П. Александроўская лірычную партыю Надзейкі («Кветка шчасця»).

У дэкадным рэпертуары закрасавала вакальнае і сцэнічнае дараванне М. І. Дзянісава. Тэмпераменту Дзянісава арганічна чужды оперныя штампы. Ён заўсёды шукае ў мастацкім вобразе жывыя чалавечыя рысы. Дзянісаў не толькі выдатна спявае партыю — ён непасрэдна жыве ў вобразе.

Дзянісаў — Кузьміч («У пушчах Палесся») любіць жыццё поўнымі грудзямі. Удалая яго арыя. Цёплая і празрыстая арыя Кузьміча «Люблю я прывольле шырокіх палёў» у выкананні артыста перадае гледачу глыбокую чалавечнасць бальшавіка-падпольшчыка, паўнату яго жыццесцвярджаючага светаадчування. Кузьміч — Дзянісаў — хвалюючы, рамантычны герой.

Зусім процілеглы Дзянісаў — Зміцер («Міхась Падгорны»). Тут ужо іншая манера сцэнічнага і вакальнага ўвасаблення партыі, мяккасць рысунка ў вобразе Кузьміча рэзка змяняецца на вострыя рысунак партыі Зміцера. Любоў Зміцера да Марысі — гэта не тое высокае пачуццё, аб якім Белінскі пісаў, што яно можа ачалавечыць нават дзікуна. Любоў Зміцера эгаістычная, дробнаўласніцкая. Пачуццё ўласніцкага самадавольства ў эмацыянальнай палітры Дзянісава—Закрэўскага займае выключнае месца. Гэта пачуццё змяняецца жывёльным страхам за кулацкі лёс у апошнім драматычным дуэце з Марысяй. Вобраз Зміцера Закрэўскага ў Дзянісава надзвычай блізкі да жыцця, да дарэвалюцыйнага вясковага быту. Вобразы Закрэўскага і Кузьміча, створаныя Дзянісавым, «жывуць сапраўдным жыццём» на сцэне.

Яркім, выдатным вакальным дараваннем і выключнымі па культуры і прыгожаму тэмбру галасамі валодаюць артысты Р. В. Млодэк і В. Ф. Лапін. У іх многа ўласнага, індывідуальнага, як у буйных артыстаў, і разам з гым многа агульнага ў тым сэнсе, што яны належаць да ліку лепшых вакалістаў тэатра. Млодэк і Лапін—натхнёныя лірыкі. Млодэк валодае лірыка-драматычным сапрана вялікага дыяпазону, прыгожым і мілагучным ва ўсіх рэгістрах. У яе чыстая фраза і інтанацыя. Артыстцы ўласцівы музыкальнасць, глыбокае пранікненне ў партытуру, тонкі музыкальны рысунак партыі.

Там, дзе кампазітар дае прастор пяшчотнай лірычнай мелодыі, Р. Млодэк адчувае сябе асабліва добра. Гора і сум, якія запалавілі душу Марысі на вяселлі з нялюбым Зміцерам, знайшлі ў асобе Млодэк непараўнальную выканальніцу. З такой-жа лірычнай сілай і непасрэднасцю яна спявае ў «Кветцы шчасця» «Ці можна верыць панскаму каханню». На спектаклях, дзе выступае Млодэк, няма роўнадушных слухачоў, яе выдатнае спяванне зачароўвае.

Слухача таксама чаруе свежы і мяккі голас В. Ф. Лапіна—вакаліста са значнай культурай і глыбокай музыкальнасцю.

Па прыродзе яго голасу і драматычнаму тэмпераменту Лапіну асабліва блізкі партыі Андрэя («У пушчах Палесся») і Міхася («Міхась Падгорны»). З вялікім пачуццём выконвае артыст лірычныя арыі і дуэты Міхася з Марысяй і Андрэя з Аўгінняй. Пранікнёна і пяшчотна спявае Лапін задушэўную, поўную глыбокага суму па любімай і перажыванняў арыю Андрэя за кратамі («У пушчах Палесся»).

Да найбольш выдатных актораў тэатра таксама адносяцца стваральнік непаўторных па свайму абаянню вобразаў Мікіты і Саўкі—П. І. Засецкі, выдатная выканальніца партыі Аўгінні С. Ю. Друкер, Л. Ф. Аляксеева, І. М. Балоцін, І. А. Мурамцаў, А. Д. Арсенка і інш.

Артысты беларускай оперы з'яўляюцца гордасцю нашага народа.

Для вырасшага і ўзмужнеўшага балетнага калектыва Опернага тэатра надзвычай паказальны творчы шлях маладога артыста С. В. Дрэчына. Прыродзе танцавальнага тэмпераменту Дрэчына чужды манернасць і галантнасць звычайных "балетных кавалераў. Дрэчын валодае моцнымі скачкамі, прыгожымі палётамі, мужнымі позамі, галавакружыцельнымі піруэтамі.

Высокі рост і прыгожая знешнасць артыста спалучаюцца з багатай танцавальнай тэхнікай і псіхалагічна выразнай драматычнай ігрой. Творчыя погляды і практыка артыста фарміраваліся перш за ўсё на асваенні стылю аднаго з лепшых савецкіх танцоўшчыкаў—А. Ермалаева, з якім Дрэчын мае шчасце штодзённа сустракацца, як з балетмайстрам і танцоўшчыкам. Зусім нядаўна Дрэчын танцаваў з чароўнай Сванільдай—Нікалаевай партыю юнага і закаханага салдата Франца («Капелія»).

У партыі Зігфрыда Дрэчын адыходзіць ад традыцыйна-лірычнага тлумачэння вобраза, узбагачаючы вобраз мужнымі драматычнымі фарбамі, якія артыст знаходзіць у музыцы П. І. Чайкоўскага. У мімічнай партыі Гірэя («Бахчысарайскі фантан») Дрэчын імкнуўся раскрыць мысль, выказаную В. Белінскім аб гэтым пушкінскім вобразе: «прасвятленне дзікай душы праз высокае пачуццё кахання».

Самая значная ўдача артыста, у якой знайшлі найбольш поўнае выяўленне асаблівасці тэмпераменту Дрэчына,—партыя Сымона («Салавей»). Дрэчын у партыі Сымона, на мове натхнёнага, узвышанага і поўнага земных эмоцый танца, апавядае гледачу аб любві да жыцця, якое буйна квітнее ў яго душы, аб шчырым і радасным пачуцці да Зоські, аб лютай нянавісці да Макара і панскіх гайдукоў.

Багацце вобраза Сымона раскрываецца артыстам у лірычным адажыё з Зоськай, у бурных варыяцыях поўнага светлым народным гумарам танца «Юрачкі». Дараванне Дрэчына яркае і натхнёнае.

Дастойны партнёр Дрэчына—А. В. Нікалаева, артыстка з багатым драматычным дараваннем і танцавальным тэмпераментам. Тайхоа («Чырвоны мак»), Сванільда («Капелія»), пар-дзяўчына («Канёк-гарбунок»), Зарэма («Бахчысарайскі фантан»)—таленавіта станцаваныя Нікалаевай, былі добрай школай для работы над паэтычным вобразам беларускай дзяўчыны Зоські.

У гэтай партыі дараванне Нікалаевай раскрылася са ўсёй свежасцю і паўнатой. У вобразе Зоські А. В. Нікалаева разумна і цёпла расказала аб узвышаным пачуцці шчырага кахання, яна паведала гледачу аб няшчасным лёсе прыгоннай беларускай дзяўчыны і праяўленай ёю мужнасці ў барацьбе за права на чалавечае пачуццё.

Упрыгожаннем балетнага калектыва з'яўляюцца мастацкі кіраўнік балета — засл. арт. РСФСР А. Н. Ермалаеў, віртуозная танцоўшчыца і выдатны педагог З. А. Васільева, артыст І. Т. Курылаў, К. А. Мулер. Лепшымі танцоўшчыцамі нашага тэатра з'яўляюцца Майсеенка, Багданава, Рубіна, Дарэніна, Залівака, Узунава, Хіраска, Уласава, Шчолкіна, з моладзі — Белановіч, Сцепанец і інш.

Сярод салістаў балета шырока вядомы Сталінскі, Самохін, Гурвіч, Іваноў, Цепрынскі, Бабанін і інш.

Творчую радасць з калектывам тэатра па праву падзяляе рэжысура тэатра: І. Ю. Шлепянаў, Н. С. Златагораў, А. Ермалаеў, дырыжоры М. Э. Шнейдэрман і Н. Б. Грубін, мастакі С. Нікалаеў, Б. Волкаў, Б. Матрунін, Л. Кроль, хормайстры Бельскі і Кананенка. Яны з'яўляюцца непасрэднымі творцамі спектакляў, якія будуць паказаны на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве, іх таленавітае майстэрства мы бачым і адчуваем у цёплых чалавечых вобразах «Міхася Падгорнага» і «У пушчах Палесся», у сцэнічна вострым і свежым па стылю спектаклі «Кветка шчасця», у таленавітым «Салаўі», у цудоўных сонечных пейзажах Беларусі, у захапляючай наш слых музыцы. Беларускія кампазітары Е. Цікоцкі, А. Багатыроў, А. Туранкоў, М. Крошнер, паэты П. Броўка, П. Глебка, М. Клімковіч сваімі операмі і балетам вывелі беларускае мастацтва ў першыя рады савецкага сацыялістычнага мастацтва.

У светлым і радасным свяце перамогі сацыялістычнага мастацтва, якое перажывае беларускі народ, ганаровае месца належыць самаму буйнаму і яркаму ў рэспубліцы калектыву Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

ПОСПЕХІ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

★ ★ ★

Н. Аладаў

Шмат вякоў над палямі Беларусі стаяў той «стон», аб якім паэт Некрасаў сказаў: «Этот стон у нас песней зовется». Але работа па збіранню і даследванню гэтай песні была пачата не вельмі даўно і вялася толькі па ініцыятыве асобных энтузіястаў. Так, у другой палове XIX стагоддзя паявілася некалькі зборнікаў беларускіх песень, з іх найбольш яркія — зборнікі Бессонава, Шэйна (без нотных запісаў), З. Радчэнка, Раманава, Янчука і нявыданыя запісы Чуркіна.

Толькі пасля вызвалення Беларусі ад белапалякаў у 1920 годзе пачалася сапраўдная работа па збіранню і вывучэнню беларускай песні.

Росквіту беларускай музыкі спрыяў таксама рост прафесіянальнай музычнай асветы, які пачаўся пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У перыяд з 1918 па 1924 год былі адкрыты музычныя навучальныя ўстановы ў Віцебску, Гомелі, Магілеве, Мінску і іншых гарадах. Асаблівае значэнне мела арганізацыя музтэхнікума ў Мінску ў 1924 годзе.

У 1932 годзе ў Мінску адкрываецца Кансерваторыя, а ў 1937 годзе — Філармонія, якая аб'яднала ў сабе, апрача сімфанічнага аркестра, беларускі хор, яўрэйскі хор, ансамбль народных інструментаў і ансамбль народнай песні і пляскі.

У сучасны момант усе музычныя ўстановы Беларусі ў значнай частцы абслугоўваюцца маладымі кадрамі, падрыхтаванымі за апошнія 15 год Дзяржаўнай кансерваторыяй БССР і музычнымі вучылішчамі.

Ва ўсіх жанрах музычнай творчасці плённа працуюць беларускія кампазітары, колькасць якіх дасягнула дваццаці, а пасля вызвалення Заходняй Беларусі з-пад панскага іга значна павялічваецца.

***

Разгледзім найбольш яркія праяўленні кампазітарскай творчасці.

Па лініі музычна-драматычнай мы маем, як вядома, тры оперы і балет, пастаўленыя ўжо нашым Оперным тэатрам. Гэта «Міхась Падгорны» Цікоцкага, «У пушчах Палесся» Багатырова, «Салавей» Крошнера, «Кветка шчасця» Туранкова.

А. Багатыроў — прадстаўнік маладога пакалення кампазітараў, які выхаваны і пачаў сваю дзейнасць у савецкіх умовах. Напісана ім параўнаўча няммога, у галіне кампазіцыі ён працуе год 5—6. Але кожны яго новы твор з'яўляецца больш спелым, больш каштоўным у параўнанні з папярэднімі. Опера «У пушчах Палесся»—найбольш значны яго твор. Не гледзячы на непазбежную для першых буйных твораў наяўнасць некаторых уплываў у оперы музыка яе пакідае ўражанне непасрэднай свежасці.

Е. Цікоцкі — кампазітар, які мае значны вопыт у галіне тэатральнай музыкі (ім напісана музычнае афармленне да вялікай колькасці п'ес), ён добра ведае аркестр, умее знаходзіць патрэбныя музычныя інтанацыі для кожнай драматычнай сітуацыі.

Музыка балета «Салавей» таксама робіць добрае ўражанне. Яркай рысай творчасці М. Крошнера з'яўляецца ўменне знаходзіць простыя, даступныя мелодыі, выкарыстанне ў меру і ў час паліфанічных прыёмаў. Як і ў оперы Багатырова найбольш удалымі з'яўляюцца лірычныя моманты балета, а таксама чыста танцавальныя нумары. Менш яркая музыка ў абрысоўцы драматычных сітуацый. Таксама, як і Цікоцкі, Крошнер увёў у свой твор рад беларускіх народных песень (танцаў), распрацаваўшы іх да пэўнай ступені ў сімфанічным плане.

Апрача гэтых твораў, Оперным тэатрам рыхтуецца да пастаноўкі «Кацярына Жарнасек» Шчэглова.

***

Інтэнсіўную работу кампазітараў бачым мы ў галіне сімфанічнай музыкі. У гэтай галіне мы сустракаемся перш за ўсё з адным са старэйшых савецкіх кампазітараў, вучнем Рымскага-Корсакава — В. А. Залатаровым. За час працы ў Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі ім напісаны сімфоніі «Чалюскін» і «Вызваленне», якой кампазітар адзначыў 15-годдзе вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Апрача гэтага, Залатаровым напісана фантазія на беларускія тэмы, сюіта з народных песень для голаса з акампанементам аркестра малага складу (пад назвай «Кантрасты»), танцавальная сюіта, уверцюра на беларускія тэмы і іншыя творы.

Другім кампазітарам, які шмат працаваў у галіне сімфанічнай музыкі яшчэ да прыезду ў Беларусь, з'яўляецца Н. І. Аладаў. За час работы ў Мінску ім напісана каля 10 сімфанічных і вакальна-сімфанічных твораў. Большасці іх кампазітар стараецца надаць драматычны характар (гэткія, напрыклад, сімфонія на беларускія тэмы, прысвечаная дню 8 сакавіка, паэма «Мацней за смерць», напісаная да 10-годдзя з дня смерці Леніна, фантазія «Дума пра пагранічніка Лагоду» і інш.), астатнія-ж, напрыклад, сімфаньета, капрычыё на беларускія тэмы альбо вясёлая уверцюра «Даёш», носяць дывертысментны характар. Аладаў спрабаваў таксама даць вопыт музычнай сатыры ў шырокім сімфанічным плане (уверцюра-фантазія «Зары насустрач», а таксама паасобныя месцы з іншых твораў).

Першымі сімфанічнымі творамі, якія паявіліся з-пад пяра беларускіх кампазітараў (у 1924—26 гг.) з'яўляюцца сімфонія Цікоцкага і сімфаньета Чуркіна. Сімфонія Цікоцкага праграмнага характару; таксама, як і «Вызваленне» Залатарова, яна прысвечана падзеям з эпохі грамадзянскай вайны і вызвалення Беларусі ад белапалякаў. Матэрыялам для сімфаньеты Чуркіна паслужылі народныя беларускія песні як папулярныя («Гляну, гляну я ў вакенца», «Ой, не кукуй, зязюленька», «Пайшоў Ясь»), так і менш вядомыя, большасць якіх запісана самім Чуркіным. Сімфаньета з'яўляецца адным з найбольш удалых твораў Чуркіна.

З сімфанічных твораў, напісаных кампазітарамі старэйшага пакалення, трэба прыгадаць яшчэ «Сюіту» і «Фантазію» Туранкова на беларускія тэмы, а таксама яго сімфанічную паэму «Чалюскінцы». Сюіта карыстаецца шырокай папулярнасцю. Гэта таленавіта зробленыя апрацоўкі народных песень, але не ў плане сімфанічнага развіцця, а ў форме, якая набліжаецца да варыяцый. Матэрыялам для кожнай з чатырох частак, якія складаюць гэту сюіту, з'яўляецца пэўная народная песня.

Каротка адзначым і сімфанічную творчасць кампазітараў маладога пакалення. Тут перш за ўсё вылучаюцца сімфоніі Багатырова, Самохіна і Падкавырава. Праўда, у сімфоніі Багатырова вельмі прыкметны ўплыў Чайкоўскага (асабліва ў пабудове тэмы ўступу і першай тэме 1-й часткі), а таксама некаторых «уверцюрных» прыёмаў кампазітараў XIX стагоддзя. Другая частка вельмі расцягнутая.

Сімфонія Самохіна напісана не зусім самастойнай мовай, не пазбаўлена агульных месц, але цёплая і шчырая, удала выкарыстоўвае народныя тэмы.

Кампазітара П. Падкавырава не здавальняюць працярэбленыя сцежкі: ён шукае свайго шляху, шукае сваю самабытную мову; права на гэта дае яму наяўнасць пэўнай, прыроджанай творчай індывідуальнасці. Але ў той-жа час ён яшчэ не зусім авалодаў тэхнікай аркестровага пісьма, тэхнікай развіцця буйных форм.

З дробных сімфанічных твораў можна прыгадаць «Казку пра маладзёжу» Багатырова,—твор для хора і аркестра, вытрыманы ў лірыка-эпічным духу; скерцо Крошнера; варыяцыі на беларускія тэмы Самохіна і два творы для голаса (баса) з акампанементам аркестра — «Буравеснік» і «Скупы рыцар» Цікоцкага.

З 1936 года ў галіне сімфанічнай музыкі працуе Н. Шчэглоў. Ім напісана сімфонія на беларускія тэмы, сюіта з народных песень, класная сюіта, канцэртныя варыяцыі для фортэп'яна з аркестрам і некалькі іншых твораў.

У сімфанічнай галіне спрабаваў свае сілы і кампазітар Г. Пукст. Ім напісана сімфонія і дзве сюіты. Аднак, у гэтым жанры ён яшчэ не знайшоў сябе.

Рад твораў напісан беларускімі кампазітарамі ў галіне камернай і інструментальнай музыкі. Тут апрача квінтэта Аладава і іншых твораў гэтага кампазітара (нонет, квартэт, варыяцыі для секстэта духавых інструментаў, санаціна для валторны і г. д.), нам вядомы квартэт Чуркіна ў 3-х частках (цікавы сваёй простай і змястоўнай распрацоўкай увайшоўшых у яго папулярных песень), трыо Багатырова, фортэп'янная саната Падкавырава, танцавальныя сюіты для фортэп'яна Клумава (апрацоўка ў віртуозным стылі народных танцаў), рандо для габоя Лукаса, скрыпічная сюіта Столава, «Беларускія фрагменты» для струннага квартэта Туранкова, некаторыя фортэп'янныя п'есы Шчэглова, творы (у большасці—фантазіі на беларускія тэмы) для цымбалаў з акампанементам фортэп'яна Туранкова, Іванова, Самохіна і інш.

Беларускі ансамбль народных інструментаў, які значна вырас пад кіраваннем здольнага дырыжора К. Сімеонава, мае ў сваім рэпертуары творы Чуркіна, Туранкова, Цікоцкага, Самохіна, Крошнера, спецыяльна напісаныя для гэтага калектыва.

За апошнія два гады нашы кампазітары ўпершыню спрабавалі свае сілы ў галіне камічнай оперы. Гутарка ідзе аб класнай оперы Чуркіна «Кок-сагыз» і аб аперэце на той-жа сюжэт Іванова і Палонскага «Зарэчны Барок».

Найбольш багатая ў нас вакальная творчасць. Усе памянёныя вышэй кампазітары маюць рад вакальных твораў. Некаторыя з гэтых кампазітараў, якія менш працуюць у іншых галінах музыкі, праяўляюць сябе тут больш значна. Сюды кожна аднесці Пукста, вакальная творчасць якога адрозніваецца мілагучнасцю і лірычнай задушэўнасцю. Апрача таго, вакальныя творы пішуць Ефімаў, Любан, Палонскі, Равенскі, Сакалоўскі, Шнеерман і інш. Большую частку гэтых твораў складаюць масавыя песні і апрацоўкі народных мелодый (як для сола, так і для хора), меншую—рамансы, арыгінальныя харавыя творы і ансамблі.

Асабліва многа працуюць нашы кампазітары над масавымі песнямі. «Палярная вахта» Падкавырава, прэміраваная на ўсесаюзным конкурсе, многія песні Туранкова карыстаюцца вялікай папулярнасцю. Вельмі ярка праявілі сябе ў гэтым жанры Іваноў, Любан і Палонскі. Рад песень гэтых кампазітараў атрымалі шырокае распаўсюджанне: «Лянок» і «Калыханка» Іванова, «Бывайце здаровы»—Любана, «Другая беларуская»—Палонскага. Неабходна адзначыць, што не гледзячы на разнастайнасць у песнях тэкставага зместу, у музыцы гэтай разнастайнасці куды менш.

***

Беглы аналіз творчасці беларускіх кампазітараў, зроблены тут, ні ў якім выпадку не прэтэндуе на вычарпальную паўнату даследвання нашых дасягненняў у гэтай галіне.

У заключэнне некалькі слоў аб растучай змене. У Беларускай Дзяржаўнай кансерваторыі выхоўваюцца новыя кампазітарскія кадры, пад вопытным кіраўніцтвам кампазітара Залатарова група таленавітай моладзі паступова выходзіць на шлях музычнай творчасці. Аднак і Кансерваторыя, і Саюз кампазітараў мала яшчэ робяць па выяўленню новых маладых кадраў кампазітараў, па дапамозе ім у авалоданні музычнай культурай і кампазітарскай тэхнікай.

Шмат талентаў у нашым народзе. І народ — цудоўны творца мастацтва. Над савецкай зямлёй гучыць песня. Гэта песня — магутны і радасны голас чалавека,—тварца новага жыцця, творца шчаслівага жыцця,—чалавека вялікай сталінскай эпохі.

Наша мара здзейснілася

Прыехала я ў БССР шэсць з паловай год назад, калі ў Тэатра оперы і балета не было яшчэ свайго памяшкання, калі прыходзілася працаваць на сцэнах розных тэатраў. Балетны калектыў быў вельмі невялікі, каля 30 чалавек. У рэпертуары тэатра быў толькі адзін балет «Чырвоны мак». Касцюмы і бутафорыю для гэтага спектакля дапамагаў рабіць сам калектыў балета.

І вось зараз гэты калектыў вязе на дэкаду беларускага мастацтва ў Маскву балет «Салавей».

З балетамі ў нас справа наогул больш складаная, чым з операй. Добрыя балеты вельмі рэдка з'яўляюцца на сцэне нават у Маскве і Ленінградзе.

«Салавей» — балет цудоўны. Стварэнне яго на беларускай сцэне — вялікае дасягненне, асабліва калі ўлічыць, што Беларусь у мінулым не мела сваёй балетнай культуры. Цяжка перадаць словамі тое хваляванне, якое мы ўсе перажываем. Наша мара аб паказе беларускага мастацтва ў Маскве здзейснілася.

Мы едзем у Маскву, едзем дэманстраваць свае дасягненні і сілы перад лепшымі людзьмі сталіцы Савецкага Саюза, перад любімым Іосіфам Вісарыёнавічам Сталіным.

Сэрца напаўняецца вялікім хваляваннем, калі ўспомніш адказнасць, ускладзеную на цябе. Я лічу за вялікую часць быць удзельніцай дэкады.

У спектаклі «Салавей» я выконваю ролю Зосі — сялянскай прыгоннай дзяўчыны. Я пастараюся данесці вобраз Зосі як мага ярчэй і лепш, прыкладу ўсё сваё майстэрства і сілы, каб прадэманстраваць наш рост і нашы дасягненні перад працоўнымі Масквы, перад любімым таварышам Сталіным.

А. В. НІКАЛАЕВА,
Заслужаная артыстка БССР.






Рэпертуар дэкады. Сцэны з спектакляў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Злева направа: 1) Сымон (саліст балета С. Дрэчын) і Зоська (засл. артыстка А. Нікалаева) у балеце «Салавей»; 2) Марыся (засл. артыстка Р. Млодэк) і Міхась (засл. артыст В. Лапін) у оперы «Міхась Падгорны»; 3) Паніч (засл. артыст І. Балоцін) і Надзейка (артыстка В. Малькова) у оперы «Кветка шчасця»; 4) Андрэй (засл. артыст В. Лапін) і Аўгіння (засл. артыстка С. Друкер) у оперы «У пушчах Палесся».

Слава партыі Леніна-Сталіна!



Рэпертуар дэкады. Сцэны з спектакляў Дзяржаўнага Мінскага драматычнага тэатра. Злева направа: 1) Пётр (засл. артыст Б. Платонаў), Якаў (засл. артыст С. Бірыла) і Люба (засл. арт. Л. Ермоліна) у «Апошніх» М. Горкага; 2) Абабурка (нар. артыст В. Владамірскі) і Харкевіч (нар. артыст Г. Глебаў) у «Пагібелі воўка» Эд. Самуйлёнка; 3) Скіба (артыст В. Краўцоў), дзед Бадыль (артыст А. Бараноўскі) і Начдзіў (артыст К. Саннікаў) у «Партызанах» К. Крапівы; 4) Тулягка (нар. артыст Г. Глебаў) і Гарлахвацкі (засл. артыст Л. Рахленка) у «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы.

Беларуская філармонія

Беларуская філармонія—маладая музычна-мастацкая арганізацыя. Заснаваная ў 1937 годзе, яна за праміпуўшыя годы вырашыла сваю асноўную задачу—умацаванне калектываў і павышэння якасці канцэртнай дзейнасці. Філармонія вырасціла і выхавала свае калектывы, якія ўяўляюць зараз каштоўныя і цікавыя арганізмы.

Сімфанічны аркестр Філармоніі, які складаецца з 60 артыстаў, планамерна рос як па шляху авалодання майстэрствам, так і па шляху выканаўчай практыкі. Галоўны дырыжор аркестра І. А. Мусін, вытанчаны музыкант і педагог, шмат працы і энергіі палажыў на стварэнне поўнагучнага ансамбля, на вывучэнне аркестрам класікаў сімфанізма і, нарэшце, на папулярызацыю і прапаганду беларускай сімфанічнай творчасці.

За кароткі час сваёй работы сімфанічны аркестр асвоіў буйнейшыя творы класікі: сімфоніі Бетховена, Берліёза, Чайкоўскага, Барадзіна і інш. Вяршыняй яго работы з'ўляецца паказ 9-й сімфоніі Бетховена. Савецкая сімфанічная творчасць была прадстаўлена 1-й і 5-й сімфоніямі Шастаковіча, сімфоніямі Кніппера, Кабалеўскага, Мяскоўскага і інш. У рэпертуары аркестра амаль усе сімфанічныя творы беларускіх савецкіх кампазітараў: Залатарова, Аладава, Багатырова, Пікоцкага, Чуркіна, Самохіна, Падкавырава, Пукста і інш.

Хор Філармоніі складаецца з 60 артыстаў. Работа гэтага калектыва мае сур'ёзныя дасягненні. Ён прыкметна расце: стаў буйнай мастацкай адзінкай, набыў тэхніку харавога выканання, дабіўся стройнага, зладжанага і насычанага гучання, тонкасці нюансіроўкі, выразнасці, красачнасці. Відаць работа і над дыкцыяй, над галачай тэксту твора. У асноўным будуючы свой рэпертуар на беларускай народнай песні і арыгінальных творах беларускіх кампазітараў, хор любоўна працуе і над класікай (Глінка, Рымскі-Корсакаў, Бетховен, Грыг, Танееў) і над творамі савецкай харавой літаратуры. Вялікую ролю ў росце хора адыграла яго сумеснае з сімфанічным аркестрам выкананне такіх буйных твораў, як 9-я сімфонія Бетховена, сімфоніі Кніппера і інш.

Высокакваліфіцыраваным і мастацка поўнацэнным кіраўніком, здольным дырыжорам паказаў сябе мастацкі кіраўнік хора І. Г. Бары, для якога гэтыя годы былі сур'ёзным экзаменам на спеласць і майстэрства.

Малады калектыў аркестра народных інструментаў, які меў у пачатку выгляд самадзейнай адзінкі, за апошнія годы, дзякуючы сістэматычнай вучобе і кіраванню дырыжора Сімеонава і кампазітара Самохіна, вырас у цікавы нацыянальны мастацкі калектыў. Спалучэнне ў агульным ансамблі цымбалаў, дудак, лір, баянаў дае аркестру арыгінальнае і своеасаблівае па фарбах гучанне, характэрнае для беларускага фальклорнага каларыту.

Ансамбль беларускай песні і пляскі з'ўляецца лепшым правадніком і папулярызатарам беларускай народнай песенна-танцавальнай творчасці. Імкнучыся да праўды, непасрэднасці выражэння, да захавання арамату і характэрных асаблівасцей народнага стылю і гучання, ансамбль песні і пляскі вядзе велізарную работу па лініі збірання дарэвалюцыйнага і савецкага фальклору, знаходзячы часта выключныя ўзоры песеннасці.

Кіраўнікам ансамбля т.т. Любану, Алексютовічу і Сакалоўскаму ўдалося вырасціць цікавы творчы калектыў.

Канцэртная дзейнасць Філармоніі надзвычай спрыяла і росту салістаў-выканаўцаў. У філарманічных канцэртах прымалі актыўны ўдзел народная артыстка Александроўская, заслужаныя артысты Дрэйзер, Млодак, Аляксеева, Дзянісаў, Балоцін, Мурамцаў, Арсенка, Бяссмертны, маладыя выканаўцы т.т. Амітон, Власаў, Клумаў, Бортэр і інш. Да работы ў Філармоніі прыцягнуты амаль усе кампазітарскія сілы рэспублікі. Асабліва творча звязаны з Філармоніяй т.т. Туранкоў, Пікоцкі, Чуркін, Любан, Сакалоўскі, творы якіх у самых разнастайных жанрах з поспехам выконваюць ансамблі Філармоніі.

На дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве Філармонія пакажа поспехі сваіх калектываў. Дэкада з'явіцца аглядам дасягненняў Філармоніі і шмат дасць для яе далейшага творчага развіцця.

Н. ШЧЭГЛОЎ.

ЗАСЛУЖЫЦЬ ПАХВАЛУ ТАВАРЫША СТАЛІНА

У Мінскім Дзяржаўным беларускім тэатры я працую са здавальненнем. Гэта такі тэатр, які мне па густу. А што для актора можа быць прыемней за калектыў, за тэатр, які любіш і сэрцам і душой?

Сваю пачатковую работу ў Мінскім драмтэатры я не магу ўспамінаць без сувязі з імем таленавітага майстра і педагога — народнага артыста рэспублікі Е. А. Міровіча. Ён мяне ўмацаваў творча, падтрымаў мяне ў стварэнні вобразаў цёплых, прыемных, у акторскім разуменні, нават тады, калі яны і адмоўныя.

Я сыграў багата розных роляў, але больш за ўсё я люблю створаныя мною вобразы Чугунова, Гарпагона, Харкевіча. Гэта адмоўныя вобразы. Мару я стварыць яркі станоўчы вобраз.

У Маскву я еду з радасным хваляваннем. На сцэне Масквы буду я іграць Тулягу ў п'есе «Хто смяецца апошнім» і Харкевіча ў п'есе «Пагібель воўка». Гэта будзе маёй творчай справаздачай. Я, як прадстаўнік беларускага народа, буду іграць у спектаклях, на якіх будуць прысутнічаць члены савецкага ўрада і дарагі таварыш Сталін. Мяне надзвычай хвалюе сустрэча з Масквой.

Едучы ў Маскву, я гару жаданнем пабачыць блізкага і дарагога чалавека, які даў шчасце майму беларускаму народу, даў яму дзяржаўнасць і мову, — пабачыць таварыша Сталіна. Іграючы даручаныя мне ў спектаклях ролі, я прыкладу ўсё сваё ўменне і сілы, каб заслужыць пахвалу таварыша Сталіна. Гэта было-б для мяне невыказным шчасцем.

Г. ГЛЕБАЎ.
Народны артыст БССР.

ДОБРЫ ДЗЕНЬ, МАСКВА!

Я першы раз у жыцці буду выступаць на сцэне перад маскоўскім гледачом. Гэта — незвычайная падзея ў маім жыцці. Тым больш, што спектаклі нашага тэатра будуць глядзець члены саюзнага ўрада і правадыр народаў таварыш Сталін.

Масква — сталіца свету. Народы СССР прывозяць сюды ўсё найлепшае, паказваюць тут свае таленты, свае дасягненні. Наша паездка ў Маскву супала з адкрыццём Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. Беларускі народ у сваім павільёне паказвае матэрыяльныя здабыткі. У гэты-ж час на сцэнах маскоўскіх тэатраў беларускі народ пакажа сваё мастацтва.

На маю долю выпала шчасце выконваць на дэкадзе дзве ролі: партызана Мікіты ў п'есе К. Крапівы «Партызаны» і калгасніка Мірона Бокуця ў п'есе «Пагібель воўка» Э. Самуйлёнка. Я люблю Мірона Бокуця, я адчуваю Мірона і лічу, што гэта адзін з лепшых вобразаў, створаных мною за 20 год работы ў тэатры.

Я дзякую беларускаму народу, што ён даў мне магчымасць новацаваць у тэатры, даў магчымасць паказаць свае здольнасці вялікаму Сталіну.

Добры дзень, любімая Масква!

В. ДЗЯДЗЮШКА.
Заслужаны артыст БССР.



Да дэкады ў Маскве. Група старэйшых актораў Дзяржаўнага Мінскага драматычнага тэатра разам з драматургам К. Крапівой (другі злева).
Фота І. Каплінскага.

Народ спявае

Вялікі знаток і аматар беларускай этнаграфіі П. Шэйн у канцы мінулага стагоддзя закончыў сваё апошняе, прадсмяротнае падарожжа па Беларусі, якое доўжылася больш поўгода.

Раз аддаўшы сябе беларускай песні, паставіўшы збіранне і папулярызацыю яе мэтаю свайго жыцця, Шэйн ужо не мог жыць без сустрэч з сялянамі і сялянкамі, якія ахвотна напявалі яму свае родныя матывы...

Этнограф Е. Раманаў пісаў: «Усе, хто толькі бываў у беларускай вёсцы, адзначаюць любоў беларуса да спеваў... Беларускія песні рашуча абвяргаюць устанавіўшуюся думку аб беднасці беларускіх мелодый».

«Беларускі народ любіць песню, любіць музыку»,—к гэтаму непахіснаму вываду прышлі ўжо ў даўнія часы вучоныя-этнографы, але пра тое, што ў гэтага народа, набыўшага дзякуючы партыі Леніна—Сталіна сваю дзяржаўнасць, будуць не толькі «жалейкі», але і кансерваторыя, і опера, а дзяўчаты з якіх-небудзь даўнейшых Караедаў будуць выступаць на вялікай дзяржаўнай сцэне,—не, пра гэта старыя вучоныя не маглі нават падумаць пры ўсёй іх багатай фантазіі.

Крапатліва і ўдумліва рыхтавалася мастацкая самадзейнасць рэспублікі да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Рыхтаваліся сотні калектываў — адабраныя адзінкі. Але і тыя, што не едуць у Маскву, непамерна выраслі за месяцы падрыхтоўкі. У гэтым сіла сацыялістычнага спаборніцтва.

Даўно палюбіла песню калгасніца Т. К. Лапаціна. Працай і намаганнямі гэтай нястомнай жанчыны ў Рэчыцкім раёне створан хор, якому можа пазайздросціць не адзін наш прафесіянальны харавы калектыў.

Рэчыцкі калгасны хор пад кіраваннем тав. Лапацінай з вялікай рэальнай праўдай перадае шчаслівае жыццё сёнешняй беларускай вёскі.

Песня — люстра жыцця. Толькі дзевяць месяцаў жывуць вольным жыццём сяляне вёскі Вялікае Падлессе Ляхавіцкага раёна Баранавіцкай вобласці, але і ў іх сёння іншыя песні. Чырвоная Армія, армія-вызваліцельніца вярнула ім свяшчэннае права спяваць на роднай мове. Якая-ж іншая песня магла прагучаць першай пасля таго, як гэта права было набыта, як не песня ўдзячнасці! І сяляне вёскі Вялікае Падлессе пачынаюць сваё выступленне песняй, створанай імі самімі: «Нам прыслала Масква надкрапленне». Багаты і разнастайны рэпертуар гэтага хора.

І такіх выдатных творчых калектываў у заходніх абласцях мноства. Разняволеная творчасць расцвіла ўсімі колерамі вясёлкі. Лепшыя сілы самадзейных калектываў ідуць на сцэну. Дасканалы хор пад кіраваннем Р. Шырмы, хор, які складаецца з былых удзельнікаў самадзейнасці, пераканаўча паказвае нам, як жыватворча сонца Саветаў.

Славіцца сваёй самадзейнасцю Хойніцкі раён нашай рэспублікі. Калі ў раёне праводзіцца алімпіяда мастацкай самадзейнасці, дык рэдка які калгас не прадстаўлен на ёй. У дэкадзе прымае ўдзел зводны калектыў гэтага раёна, яго танцоры пляшуць «Мяцеліцу» і «Мікіту» (пастаноўка балетмайстра І. Ліневіча).

У Хойніцкай МТС самадзейнасцю кіруе слесар тав. Гофман. У залатых руках усякая справа спорыцца. І колькі яшчэ такіх таленавітых самародкаў у нашай краіне, людзей, якія набылі магчымасць развіваць свае прыродныя дараванні!

Разнастайнасць жанраў — вялікая сіла нашай самадзейнасці.

Але вернемся яшчэ да аднаго цудоўнага нумара заключнага канцэрта. Шмат непадробнага майстэрства, вынаходлівасці ў плясцы чыгуначнікаў (пастаноўка тав. Рыбальчанкі), якая выконваецца дзіцячай танцавальнай групай Гомельскага чыгуначнага клуба імя Леніна.

Самадзейнасць беларускага народа заняла на дэкадзе пачэснае месца: у заключным канцэрце побач з заслужанымі артыстамі выступаюць чырвонаармейцы, даяркі, трактарысты, аратыя, слесары. Таленты гэтых людзей узбагачаюць наша мастацтва.

Еф. САДОЎСКІ.

Г. БЯРОЗКІН

Нашы п'есы

В. Г. Белінскі лічыў драму вянцом мастацкай творчасці. Ён лічыў, што толькі ва ўзбраенні спелага вопыту пісьменнік пераходзіць к драме. Той факт, што большасць беларускіх пісьменнікаў — празаікаў, паэтаў, у апошнія часы плённа прапавала ў галіне драматургіі, з'яўляецца сведчаннем узмужнеласці і росту ўсёй беларускай савецкай літаратуры.

Ступень удачы таго ці іншага драматычнага твора вызначаецца значэннем дзеючых у ім чалавечых характараў. Аб'ектыўная закономернасць вобраза з'яўляецца самай неабходнай умовай поўнацэннага драматычнага твора.

Беларуская савецкая драматургія можа лічыць ужо цалкам пройдзеным той пачатковы перыяд свайго развіцця, які азнаменаваўся зыбкім, лірычна-расплывчатым стылем. У лепшых п'есах нашых драматургаў дзейнічаюць поўнацэнныя чалавечыя характары. Чытач і глядач адчуваюць цвёрдую аб'ектыўную логіку ў развіцці вобраза, створанага драматургам. Гэта і абумовіла ўдачу лепшых нашых п'ес.

Ва ўсіх лепшых п'есах нашых драматургаў заўважаюцца ўпартыя безупынныя пошукі гераічнага характару. Зусім невыпадкова ў нашай драматургіі пераважае тэма грамадзянскай вайны, бо гэта тэма дае неабмежаваныя магчымасці паказаць гераічны характар у дзеі, у абстаноўцы, патрабуючай максімальнага ўздыму духу. Нашы драматургі звярачваюцца да гераічнага мінулага беларускага народа, адшукваючы ў ім найвышэйшыя ўзоры чалавечай самаафірнасці, служэння праўдзе, натхнёнага подвіга. Вось чаму нашы лепшыя п'есы, напісаныя на гістарычныя тэмы, гучаць і сёння свежа, актуальна, пераклікаюцца з сёнешнім днём.

У адной з лепшых п'ес беларускай савецкай драматургіі, у «Партызанах» Кандрата Крапівы, сяляне, ратуючыся ад зверстваў белапольскіх акупантаў, ідуць у лясы, каб сабраць сілы для рашучага бою з нягоднымі прышэльцамі. Перад чытачом альбо гледачом праходзіць жыццё і быт партызанскага лагера з усімі яго штодзённымі клопатамі, патрэбамі, інтарэсамі. І чытача (гледача) увесь час не пакідае пачуццё, што перад ім, уласна, не армейскі лагер, не вайсковае злучэнне, якое мае чыста стратэгічныя мэты, — а лагер моцных, мужных людзей, прымушаных узяцца за зброю, каб адстаяць сваю крывёю і потам палітую зямлю. Не толькі колькасцю і сілай сваёй пераважаюць яны паноў, а багаццем і глыбінёй пачуццяў, чалавечнасцю сваіх перажыванняў.

Безымянная сялянка-маці гіне ад панскай кулі, грудзьмі засланяючы сына. Вобраз яе вырастае ў сімвал вышэйшай чалавечнасці, чыстаты, бескарыслівасці. Селянін, прышоўшы ў партызанскі лагер, расказвае, з якімі ўшанаваннямі, як кранаюча-любоўна выхавалі сяляне простую сялянскую маці. К. Крапіва з вялікай сілай рэалістычнага майстэрства паказаў маральную і духоўную перавагу народа над сваімі прыгнятальнікамі. Лепшыя і бескарыслівыя пачуцці заўсёды ўласцівы народу, і па меры таго, як драматург шчыльна падыходзіць да паказу тых альбо іншых асаблівасцей і рысаў народнага характару, ён вылучае паасобных асобносьбітаў гэтых рысаў і якасцей. Сярод чалавечых вобразаў нашай драматургіі вылучаецца сваёй праўдай, сваёй рэльефнасцю вобраз дзеда Бадыля, які зрабіўся любімым вобразам нашага гледача.

Абагулены вобраз народа-змагара даў у сваёй п'есе «У пушчах Палесся» Якуб Колас. У ёй пераважае ўжо зусім іншая, у параўнанні з «Партызанамі», былінная, я-б сказаў, танальнасць. Цэнтральны герой п'есы — дзед Талаш вельмі падобны на герояў эпічных былін, складзеных народам. У ім багатырская сіла, казачная дужасць. Але скрозь гэтыя казачна-павялічаныя ўяўленні аб Талашу праступаюць бясконца жывыя, рэальныя рысы народа-багатыра. Дзед Талаш непрымірымы к ворагам народа і па-бацькоўску прыхільны да сваіх сяброў-партызанаў. Ён любіць свой край, сваё Палессе. І ўсім гэтым уласцівасцям характару Талаша знарок наладзены нейкія былінна-эпічныя формы.

Тэме грамадзянскай вайны прысвечана і п'еса Пятра Глебкі «Над Бярозай-ракой». Цяжка пераацаніць значэнне гэтай п'есы ў развіцці нашай драматургіі. У п'есе П. Глебкі «Над Бярозай-ракой» наша драматургія ўпершыню спрабуе даць вобраз аднаго з найвялікшых людзей нашага часу, друга і саратніка Леніна і Сталіна, — вобраз гераічнага палкаводца Серго Орджанікідзе. Такім чынам, можна сказаць, што п'еса Глебкі абагульняе вопыт стварэння станоўчага вобраза ў нашай драматургіі. Яна дае найбольш канцэнтрыраванае выражэнне лепшых, ідэальных уласцівасцей пролетарскага правадыра — яго мэтанакіраванасць, чалавечнасць, гатоўнасць памерці за шчасце народа.

П'еса Глебкі сімптаматычна і ў тых адносінах, што яна прыдае нашай драматургіі нехапаючы ёй пафас, сапраўды драматычны размах страсцей. Яна ўзнаўляе на новым ідэйна-тэматычным групле традыцыі рамантычнай драмы, якая высока ўзнімаецца над бытавой паверхняй жыцця. І недахопы п'есы Глебкі з'яўляюцца толькі «издержками» вялікай плённай работы, зробленай драматургам.

Наша драматургія развіваецца па шляху павышэння свайго інтэлектуальнага ўзроўню, узроўню мыслі, увасобленай у ёй. Тут, апрача п'есы Глебкі, павінны быць прыняты пад увагу і «Пагібель воўка» Эдуарда Самуйлёнка, і «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага, і «Кацярына Жарнасек» М. Клімковіча.

У нас яшчэ вельмі мала п'ес, прысвечаных новай сацыялістычнай рэчаіснасці. А тыя нямногія, якія напісаны, часта хвараюць фактаграфічнай абмежаванасцю. Драматург проста пераносіць у п'есу некалькі выпадкаў, якія мелі месца ў нашай рэчаіснасці, не спрабуючы іх абагуліць з пункту гледжання вялікай ідэі камунізма. Так узніклі шматлікія «шпіёнскія» п'есы. Тым больш значная перамога Эд. Самуйлёнка, здолеўшага ў сваёй п'есе «Пагібель воўка» увасобіць глыбокую і значную мысль аб нараджэнні новых чалавечых узаемаадносін, аб гібелі прыватна-ўласніцкага інстынкту ў чалавечых душах. П'еса Самуйлёнка моцна сваёй ідэяй,—ідэяй разняволенай чалавечнасці, ідэяй дружбы і спаборніцтва, якія становяцца асноўным законам жыцця. Вось чаму так праўдзівы калгаснікі, паказаныя Самуйлёнкам, бо ў іх учынках, у іх гумары, у самым стылі іх паводзін адчуваюцца новыя адносіны да свету, новая зычлівасць да людзей, якая з перамогай сацыялізма набывае зусім рэальны змест. Ворагі спрабуюць навязаць нашаму жыццю старыя воўчыя законы, яны хочуць вярнуць нянавіснае мінулае, у якім панавалі хцівы грашовы інтарэс, крывавая эксплаатацыя чалавека чалавекам. Герой п'есы Самуйлёнка — Харкевіч паказан не так, як часта паказваюць на сцэне ворагаў, не плоска і аднолінейна. За Харкевічам адчуваеш той свет, пераконаным прадстаўніком якога ён (Харкевіч) з'яўляецца, свет, з якім трэба змагацца рашуча і бязлітасна. Харкевіч пераконан, што закон «чалавек чалавеку воўк» з'яўляецца адзнакай, іманентна-ўласцівай самой прыродзе чалавечага жыцця. Ён лічыць, што свет не можа існаваць без падпарадкавання адной часткі людзей другой, ён актыўна змагаецца за тое, каб аднавіць разбураныя сацыялістычнай рэвалюцыяй каноны ўласніцкага грамадства. І Харкевічу супроцьстаіць вялікі калектыў чэсных сацыялістычных працаўнікоў, якія ствараюць свой лёс уласнымі рукамі і адкідаюць усякую прыніжаючую апеку вышэйстаячых «бажэсцвеных» сіл.

Тая-ж ідэя вызвалення чалавецтва з-пад улады прыватнай уласнасці ляжыць і ў аснове п'есы Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына».

Развіваючы ў сваіх п'есах ідэі вялікага сэнсу і глыбіні, нашы драматургі сустракаюцца з цяжкасцямі пластычнага, вобразнага выражэння гэтых ідэй. І невыпадкова многія нашы п'есы яшчэ не дасканалыя, у іх шмат рысаў літаратурнай інсцэніроўкі замест рысаў поўнацэннага сцэнічнага твора.

Аднак, развіццё нашай драматургіі ішло па шляху набліжэння да сапраўды арганічнага тэатра. Ужо не інсцэніроўка, а сапраўды арганічная драматургія пераважае ў лепшых п'есах, напісаных нашымі драматургамі. Так, бліскучым выражэннем авалодання складаным жанрам камедыі з'яўляецца п'еса К. Крапівы «Хто смяецца апошнім», якая пры ўсіх сваіх недахопах ёсць станоўчая падзея ў нашай драматургіі.

Вазьміце такую сцэну з «Партызанаў» К. Крапівы, калі кіраўнік партызанаў Даніла Дрыль, таячыся, прыходзіць у хату к Рыгору, які праз сваё каханне да кулацкай дачкі Кацярыны гатоў выдаць польскім уладам сябра Данілу. Гэта сцэна з'ўляецца лепшай і каштоўнейшай знаходкай усёй нашай драматургіі. У ёй агульныя гістарычныя падзеі, якія ляжаць у аснове п'есы, гранічна канкрэтызіруючыся, прымаюць характар бясконца-індывідуалізіраваных «прыватных» канфліктаў. З агульна-ідэйнай задачы тэма барацьбы народа з белапалякамі пераходзіць у план жывога і дзейснага паказу. Гэта і ёсць спелая драматургія, якая не паказвае гледачу гатовых вынікаў, формул, вывадаў, а сочыць за шляхам іх узнікнення. Вось чаму, калі Рыгор пасля доўгай унутранай барацьбы прыходзіць, нарэшце, к партызанам, глядач (чытач) успрымае гэты крок героя, як завяршэнне вялікага і складанага працэсу, сведкай якога ён сам, глядач, з'ўляецца.

Альбо сцэна канфлікту Харкевіча з дачкой («Пагібель воўка»), калі Харкевіч спрабуе апрануць Насцю ў чапцы, шалі, падораныя яму паняй-дабрачыннніцай, — гэта сцэна ў гранічна-індывідуалізіраванай форме выражае супярэчнасці паміж халуйскай філасофіяй старога свету і новымі поглядамі на жыццё, на свет свабоднага сацыялістычнага чалавека. Насця глядзіць на ўбранні пані Шабінскай, клапатліва прыхаваныя бацькам, як на забаўныя, аляпавата ўпрыгожаныя бяздзелкі, што былі ўцехай дзікуну.

Беларускія савецкія драматургі шырока выкарыстоўваюць у сваіх п'есах матэрыял народнай творчасці. Народ супроцьстаіць сваім ворагам ва ўсім багацці і бляску вялікай паэтычнай традыцыі, ва ўстойлівасці вялікага жыццёвага вопыту. І бальшавікі, прыходзячы ў сялянскую хату, дагаварваюцца з сялянамі на народнай песні («Партызаны» Крапівы).

У лепшай п'есе нашага дзіцячага рэпертуара, у «Цудоўнай дудцы» В. Вольскага беларускі фальклор існуе не толькі, як узор для стылізацыі, але і перш за ўсё, як канструкцыйны фактар, які вызначае характар стылю і кампазіцыі п'есы ў цэлым.

Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве беларуская савецкая драматургія прыходзіць ідэйна і творча ўзмужнелай.

НЯХАЙ ЖЫВЕ ТАЛЕНАВІТЫ БЕЛАРУСКІ НАРОД!

★ ★ ★

Народнае мастацтва

М. Грынблат

Разам з лепшымі акторамі, спевакамі, музыкантамі і танцорамі ва ўсенародным урачыстым паказе выдатных дасягненняў беларускай культуры ў Маскве прымуць удзел таксама беларускія жывапісцы, графікі, дэкаратары і скульптары. На спецыяльна арганізаванай выстаўцы ажыўшыя палотны і скульптуры мовай вобразаў і фарбаў раскажуць пра небывалы росквіт беларускага выяўленчага мастацтва. Шматлікія экспанаты народнай творчасці на гэтай-жа выстаўцы прадэманстрыруюць шматвяковую мастацкую традыцыю беларусаў.

Беларускае народнае выяўленчае мастацтва багата і шматгранна. Сваімі карэннямі яно ўходзіць у глыбокую даўнасць і, як мастацтва іншых народаў, ужо на найбольш ранняй стадыі свайго развіцця знаходзіцца ў непарыўнай і сталай сувязі з працай. Таму мастацтва беларускага народа здаўна выступае, перш за ўсё, на прыладах вытворчасці і прадметах матэрыяльнага быту — у адзежы, жыллі, хатнім пачынні і пасудзе, у прадметах культу і г. д. Ва ўсім гэтым відную ролю адыгрывае даўняя традыцыя і ў той-жа час імкненне народа да ўпрыгожання акружаючых яго ў жыцці рэчаў, любоў да мастацка-эстэтычнай апрацоўкі іх.

Нават у самыя цяжкія часы прыгоннага рабства, гібеючы ў непасільнай паднявольнай працы і ў беднасці, народ падбадзёрваў сябе песняй, імкнуўся ўпрыгожыць свой шэры быт, сваю нахілую хату, зрэбную адзежу. У гэтым — выражэнне ўласцівага народу аптымізма.

Падыходзячы да хаты беларускага селяніна, адразу можна заўважыць выражэнне мастацкага густу народа ў знешніх аздобах франтона, канька, вакон, ганку. У сенях мы знаходзім проста, але прыгожа аздобленыя прылады і прадметы хатняга ўжытку. У самой хаце звяртае ўвагу стракатасць сцен, аклееных размаляванымі абоямі свайго вырабу, развешаная яркая адзежа, тканыя і вышытыя палаценцы, распісны куфар, з густам скроеныя фіранкі на вокнах, кветкі і гірлянды з каляровай стружкі, плецены з саломы «павук» пад столлю, арнаментаваная пасуда і г. д. Увесь жыццёвы ўклад здаецца казачна ўзбагачаным мастацтвам.

Асноўнае месца ў беларускім выяўленчым мастацтве належыць арнаменту, які глыбока ўвайшоў у жыццё і быт народа. Выражан арнамент пераважна на тканіне.

Ткацкае майстэрства беларускай сялянкі з'яўляецца рэзультатам многавяковага вопыту, які перадаваўся і ўдасканальваўся з пакалення ў пакаленне. На адным і тым-жа прымітыўным станку-кроснах, на якіх вякамі ткалася самае простае палатно, выраблялася найтанчэйшая, багата дэкарыраваная тканіна. Карыстаючыся камбінацыяй дадатковых «нітоў» і «дошчачак», беларуская сялянка дасягае вяршынь ткацкага мастацтва.

Багацце дэкарацыйнага рысунку беларускай тканіны дасягаецца ўмелым выкарыстаннем прасцейшых геаметрычных элементаў, расстаноўкай іх рытмічнымі несканчаемымі радамі; камбініраваннем фігур рознага памеру ў сіметрыі і г. д. Асобную ролю адыгрывае тут расцветка.

Даволі значнае пашырэнне на Беларусі мела дыванаткацтва. Майстэрні па вырабу дыванаў і габеленаў у рада памешчыкаў існавалі да 50—60 г.г. XIX стагоддзя. Захаваўшыяся дываны работы прыгонных ткачых па сваёй тэхніцы, дэкарацыйных формах, кампазіцыі і распрацоўцы каймы нагадваюць украінскія кілімы. Асноўнае месца ў арнаменце старых беларускіх дываноў займаюць рысункі стылізаваных кветак, лісцяў і галінак, аб'еднаных у раслінную кампазіцыю з багатым цэнтрам.

Заглохшае яшчэ задоўга да рэвалюцыі беларускае народнае мастацтва дыванаткацтва адраджаецца ў нас на новай аснове. Майстэрства і вопыт беларускіх рукадзельніц выразіліся ў стварэнні новых дывановых вырабаў. У дывановую і габеленную творчасць шырока пранікае совецкая тэматыка. Асабліва мастацкай выразнасці дасягнулі габелены з любоўна вытканымі партрэтамі Леніна і Сталіна.

Выдатнымі ўзорамі беларускага мастацкага ткацтва з'яўляюцца паясы, якія здаўна былі неабходнай прыналежнасцю беларускага нацыянальнага касцюма і займалі віднае месца ў народных абрадах і звычаях. Яркі арнамент з каляровых шарсцяных нітак, рэльефна выступаючы на светлай парцяной аснове, надае беларускім паясам асабліва маляўнічы характар.

Выдатнымі помнікамі старажытнага беларускага мастацтва XVIII стагоддзя з'яўляюцца славутыя слуцкія шаўковыя паясы, пратканыя залатымі і сярэбранымі ніткамі. Паасобныя экземпляры іх захоўваюцца ў лепшых музеях свету.

Беларускія ткачы, працаваўшыя на слуцкай фабрыцы, першапачаткова капіравалі персідскія ўзоры. Але праз некаторы час у арнамент слуцкіх паясоў шырока пранікаюць мясцовыя раслінныя матывы — васількі ці валошкі, чырвоная гваздзіка, незабудка, стылізаванае лісце і г. д. Працэс пераасэнсавання персідскіх узораў беларускімі ткачамі выдатна паказан Максімам Багдановічам у вершы «Слуцкія ткачыхі».

Асабліва звяртае на сябе ўвагу беларуская народная арнаментыка — найбольш папулярны від выяўленчага мастацтва.

Дайшоўшыя да нас беларускія арнаментальныя формы з'яўляюцца прадуктам калектыўнай творчасці многіх пакаленняў і стагоддзяў. Здзіўляючае багацце, прыгажосць і разам з тым мудрая прастата беларускага арнаменту дасягнута працяглай шліфоўкай, калектыўным напружаннем творчай думкі народа.

Найбольшай мастацкай выразнасці тканы і шыты арнамент дасягае на адзежы і рушніках.

Яркі па фарбах і формах беларускі нацыянальны касцюм заўсёды быў аб'ектам асаблівай мастацкай увагі народа. Нацыянальная адзежа дае больш поўнае ўяўленне аб народным арнаментальным мастацтве, аб яго дасканалых формах і кампазіцыі.

Народнае майстэрства і гарманічная ўвязка арнаменту з формай і пластыкай прадмета выразна выступае і на беларускіх рушніках. Тлумачыцца гэта той важнай дэкарацыйнай роллю і тым вібным месцам, якое наогул займаў узорчаты рушнік у народным быту.

Агульны від беларускага тканага («перабіранага») арнаменту геаметрычны. Важнейшы элемент, складаючы геаметрычную тэму — ромб («круг»), яго варыянты і паасобныя часткі. У залежнасці ад таго ці іншага ўскладнення ромба рысунак атрымоўвае асобнае найменаванне. Арнамент шыты («нашываны») дае больш магчымасцей для расшырэння круга матываў і сюжэтыкі, у ім часцей сустракаюцца раслінныя і нават зоалагічныя формы, але і тут геаметрычны рысунак застаецца дамініруючым.

Беларускі ўзор шырока апаэтызіраваў, ператварыў у мастацтва рэальныя прадметы прыроды, быту. Аб гэтым сведчыць багатая народная наменклатура ўзораў (сякеркі, барана, вакенцы, шасцёры, каравай, елачка, кляновы ліст, пчолка, капытцы, валовае вока і г. д.).

У наш час мы назіраем узнікненне новых арнаментальных форм, пранікненне ў народны ўзор новай, совецкай тэматыкі. Асабліва вылучаюцца матывы совецкай эмблемы — серп і молат у рознай кампазіцыі, пяціконцая зорка, колас, сноп, кветка ільну і інш. Адначасова ўзбагачаецца расцветка.

У кампазіцыі беларускага арнаменту пераважае бардзюр. Абумоўлена гэта месцам арнаментацыі — краем адзежы, рушніка, абруса, хусткі і г. д. Рытмічнае чаргаванне матываў робіць уражанне бесканечнай паласы.

Побач з мастацтвам упрыгожання тканіны, — тканым і шытым арнаментам, вязаннем і пляценнем, набойкай, — характарызуючым, пераважна, беларускае народнае выяўленчае мастацтва, павінна быць адзначана мастацкая апрацоўка дрэва.

Вырабы з дрэва займалі асаблівае месца ў матэрыяльным быту беларуса, спрадвеку жыўшага сярод лясоў. Гаспадарчае абшчэнне з лесам спрыяла накапленню багатага вопыту, развіццю навыкаў і майстэрства ў мастацкай апрацоўцы прадметаў з дрэва.

У беларускай народнай разьбе вядомы тры асноўных спосабы арнаментацыі: лінейна-нарэзны, ажурны і рэльефны.

Лінейна-нарэзны арнамент, найбольш даўні, ужываецца пры ўпрыгожванні насуды і прадметаў хатняга ўжытку (коўшыкаў, салонак, лыжак, верацён, пурак і г. д.).

Асабліва прадстаўлена беларуская мастацкая разьба ў архітэктурных аздобах жылля. У розных месцах Беларусі захаваліся выдатныя ўзоры архітэктурных аздоб, выкананых пераважна ажурнай разьбой. Улюбёныя месцы знадворных аздоб хаты — вокны, франтон («шчыт») і канёк. У арнаменце надваконнікаў і падваконнікаў часцей сустракаюцца моцна стылізаванае лісце, кветкі, фантастычныя раслінныя парасткі, вобразы птушак і жывёл, па-майстэрску ўвязаныя з архітэктурай жылля.

У сучасных архітэктурных аздобах калгаснага сяла звяртае ўвагу выкананне разьбы ў новым тлумачэнні арнаменту, якое выражана ў спалучэнні старых матываў з совецкай тэматыкай.

Драўляная скульптура дасягнула свайго развіцця толькі ў совецкі час. У мінулым яна была звязана пераважна з рэлігійным культам і вырабам цацак.

Народная разьба вызначаецца сваёй дэкарацыйнасцю, сакавітасцю і сапраўдным адчуваннем жыцця.

Побач з іншымі відамі мастацкай апрацоўкі дрэва высокага ўзроўню дасягнула і пляценне з лазы, лубу, стружкі, а таксама вырабы з кары, карэнняў, саломы.

На багатым вопыце і майстэрстве мастацкай апрацоўкі дрэва грунтуецца развіццё гэтай галіны беларускага народнага мастацтва ў сучаснай народнай творчасці. Таленавітыя рэзчыкі, скульптары, інкрустатары і мазаічысты, невядомыя ў мінулым, ва ўмовах соцыялізма атрымалі шырокія магчымасці для развіцця і ўдасканалення сваіх здольнасцей.

Сучасная беларуская народная творчасць ведае цэлы рад выдатных майстроў, народных мастакоў.

Дастаткова ўказаць на калгасніка арцелі «Чырвонаармеец» Альхоўскага сельсовета Магілеўскага раёна Я. С. Арлова, работы якога вядомы далёка за межамі БССР (сундук-унікум для «Пісьма беларускага народа вялікаму Сталіну», тэкст ваеннай прысягі, падпісанай таварышам Сталіным, і цэлы рад іншых інкрустацыйных работ, выкананых тав. Арловым з групай народных майстроў-калгаснікаў).

Небывала расцвіла і народная творчасць у галіне скульптуры на дрэве. Народныя скульптары-рэзчыкі натхнёна ствараюць вобраз таварыша Сталіна, адлюстроўваюць у сваёй творчасці ўсю шматграннасць совецкай рэчаіснасці.

Да даўніх мастацкіх рамёслаў беларусаў адносіцца таксама кераміка і ганчарства. Прадукцыя народнага ганчарства дае многа мастацкіх форм, якія вызначаюцца зграбнасцю і прыгожасцю аддзелкі.

Шырока развіт на Беларусі выраб гліняных цацак — дудак, вугак, зайчыкаў, конікаў, баранчыкаў і інш.

Здаўна на Беларусі, асабліва на Віцебшчыне і Магілеўшчыне, развіт выраб мастацкай кафлі. Паасобныя кафлі, якія захоўваюцца ў Віцебскім музеі, адзначаны 1686 годам.

Мастацкая кераміка і ганчарства на Беларусі ведае выдатных майстроў. Лепшыя майстры ішлі на заводы, узбагачаючы сваімі ведамі, вопытам і ўмельствам мастацкія якасці прамысловых вырабаў ганчарства, керамікі і шкла. Так, шырока славіліся вырабы майстроў-беларусаў фаянсавай фабрыкі ў с. Целеханы б. Пінскага павета. Далёка за межамі Беларусі праславілася вядомае мастацкае шкло урэцкага завода ў б. Слуцкім павеце.

Мастацкую традыцыю беларускіх ганчароў прадаўжае зараз барысаўская ганчарная арцель. Свае вырабы арцель не раз дэманстрыравала на мастацкіх выстаўках.

Да іншых відаў беларускага выяўленчага мастацтва адносіцца мастацкі роспіс, апрацоўка скуры, рога, косці, метала і г. д.

Мастацкі роспіс у мінулым асабліва ўжываўся на вырабах з дрэва. Узорным роспісам аздабляліся прадметы ўжытку, цацкі, баржы, куфры. Апошнія распісваліся асабліва багата. Народнае майстэрства роспісу праявілася таксама на вялікодных пісанках, звязаных яшчэ з дахрысціянскім вясенним аграрным культам. Выдатныя гродненскія пісанкі будуць паказаны на выстаўцы ў Маскве.

Карцінны жывапіс амаль не быў знаёмы дарэволюцыйнай народнай творчасці, калі не лічыць іконапіснага мастацтва.

Развіццё карціннага жывапісу прыпадае толькі на совецкі перыяд і звязана з росквітам масавай мастацкай самадзейнасці і культуры совецкага народа. Стварэнне дамоў народнай творчасці значна садзейнічала развіццю гэтай галіны мастацтва. Выстаўкі народнай творчасці апошніх год выявілі нямала таленавітых народных майстроў-жывапісцаў, напаўняючых рады прафесіянальных мастакоў.

Прадукцыя народнага мастацтва сведчыць аб невычарпальных творчых магчымасцях, захаваных у беларускім народзе.

На шырокай базе выкарыстання шматграннага і дэкарацыйнага народнага мастацтва ўзбагачаецца новае, совецкае мастацтва ордэнаноснай Беларусі.

★

Ансамбль чырвонаармейскай песні і пляскі

Гэта было ў пачатку 1938 года. Лепшыя спевакі і танцоры мастацкай самадзейнасці Беларускай ваеннай акругі з'язджаліся па аднаму ў Смаленск. Ваенны Совет акругі дазволіў фарміраванне ансамбля чырвонаармейскай песні і пляскі.

Невялікая група спевакоў і танцораў з гарачым, уласцівым байцам Чырвонай Арміі парывам узялася за работу. Праз тыдзень ужо гучаў стройны, зладжаны хор, ігралі баяны, віхрам кружыліся танцоры. Праз колькі месяцаў ансамбль стаў аператыўнай мастацкай адзінкай, якая мела ўжо вялікую канцэртную праграму. Дружнай работай калектыў пад кіраўніцтвам тав. Усачова, які сам выйшаў з вядучага актыва чырвонаармейскай мастацкай самадзейнасці, за кароткі тэрмін дабіўся добрых мастацкіх якасцей. Байцы палюбілі свой ансамбль і кожнае выступленне яго ў часцях акругі стала вялікім святам, якога з нецярплівасцю чакалі. Совецкія песні, лепшыя харавыя творы пра вялікага друга і правадыра працоўных таварыша Сталіна, баявыя песні Чырвонай Арміі, перанятыя ад ансамбля, уваходзілі ў культурны быт чырвонаармейцаў і каманднага складу. Самадзейныя калектывы пачалі вучыцца ў ансамбля харавому мастацтву і мастацтву чырвонаармейскай пляскі. Значэнне ансамбля ў культурна-выхаваўчай рабоце сярод асабістага складу часцей акругі стала, бясспрэчна, вялікім і значным.

Канцэртная праграма ансамбля паступова станавілася больш шырэйшай, атрымала некалькі варыянтаў. Паявілася шмат плясак, нумараў сольнага вакалу, інструментальна-сольных выступленняў, мастацкага чытання. Шмат сіл аддаў кіраўнік ансамбля тав. Усачоў рабоце над удасканаленнем хора. Падбіраліся складанейшыя хоры, як хор салдатаў з оперы «Фауст» Гуно, «Серэнада» Абта, «Закувала та сіва зозуля» Нішчынскага, хор стральцоў з оперы «Хаваншчына» Мусаргскага і рад іншых. Складанейшыя харавыя творы ў доўгай і ўпартай рабоце над імі станавіліся не толькі музыкальна пісьменнымі, але і філігранна адточанымі, дыкцыя чыстай і дасканалай, вобразы твораў яснымі і зразумелымі.

Пляскі і танцы здзіўлялі сваёй гібкасцю, акрэсленасцю рысунка, прастатой кампазіцыі, чырвонаармейскім удальствам.

Зараз у рэпертуары ансамбля звыш ста харавых твораў, звыш дзесятка плясак і танцаў. Канцэрты яго праходзяць з вялікім поспехам. Ансамбль вядомы не толькі ў часцях БАВА, яго добра ведае грамадскасць Мінска і раду гарадоў БССР.

У дні вызвалення працоўных Заходняй Беларусі з-пад іга польскіх капіталістаў і памешчыкаў ансамбль ішоў пад камандай батальённага камісара тав. Цвяткова разам з часцямі, як баявая адзінка. Яго можна было бачыць і на прывалах часцей і чуць у вызваленых беларускіх вёсках. Поспехі яго ў тыя дні, дні радасці вызвалення, былі асабліва вялікімі, ансамбль прапагандыраваў шчаслівае жыццё людзей краіны Советаў, сваімі выступленнямі сведчыў пра высокую культуру Чырвонай Арміі, пра яе баявую магутнасць.

Сотні канцэртаў за два з лішнім годы сотні тысяч абслужаных канцэртам байцоў, камандзіраў, працоўных — вось пераканальны паслужны спіс ансамбля.

Мастацкая якасць ансамбля, вырастаючая ў вялікае прафесіянальнае майстэрства, — яго простая перспектыва. Увага да ансамбля палітарганаў і любоў байцоў і камандзіраў — яго маральная сіла.

Ансамбль зацверджан урадавай камісіяй да ўдзелу ў дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Чэсць гэта — па заслугах.

Пажадаем-жа выдатнаму чырвонаармейскаму калектыву ў паказе мастацтва беларускага народа працоўным Масквы вялікіх і выдатных поспехаў.

В. ГЛАЗЫРЫН.



«Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі». Карціна М. Манасзона.
Фотарэпрадукцыя І. Каплінскага.

ВЫСТАЎКА БЕЛАРУСКАГА МАСТАЦТВА Ў МАСКВЕ

У часе дэкады беларускага мастацтва ў Маскве разам з тэатральнай і музычнай творчасцю беларускага народа працоўным сталіцы нашай радзімы будзе паказана і выяўленчае мастацтва БССР. Выстаўка беларускага выяўленчага мастацтва пакажа Маскве ўсё лепшае, што створана мастакамі, жывапісцамі, скульптарамі і графікамі, майстрамі народнай творчасці не толькі за годы совецкай улады, але і ў перадрэволюцыйны час.

Наведвальнік выстаўкі ўбачыць выдатныя мініяцюры, напісаныя вопытнай рукой мастакоў XI і пазнейшых стагоддзяў, убачыць першыя беларускія друкаваныя кнігі, упрыгожаныя выдатнымі гравюрамі першага беларускага гравера Францышкі Скарыны з Полацка (пачатак XVI стагоддзя), Васіля і Максіма Вошчанкі з Магілева (канец XVII і пачатак XVIII стагоддзя), прыдворнага гравера князёў Радзівілаў Гершко Лейбовіча з Несвіжа, цудоўную калекцыю славутых на ўвесь свет слуцкіх паясоў, вытканых рукамі выдатных народных майстроў. Глядач убачыць узоры выдатных па свайму майстэрству роспісаў, якімі былі пакрыты архітэктурныя пабудовы Беларусі таго часу (магілеўская сінагога і інш.). У аддзеле дарэволюцыйнага мастацтва Беларусі будуць паказаны творы выдатных мастакоў — Ю. М. Пэна, А. Альперовіча, Я. М. Кругера і іншых. Іх творы будуць завяршаць аддзел.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя адкрыла бязмежныя магчымасці для росту і росквіту народных талентаў, для развіцця ўсіх мастацтваў.

У першыя годы рэволюцыі разам з Ю. М. Пэнам у Віцебску працуе адзін з выдатнейшых мастакоў-графікаў С. Юдовін, адзін з буйнейшых беларускіх мастакоў А. М. Бразэр і многія іншыя. Пазней у Віцебску-ж працаваў зараз заслужаны дзеяч мастацтваў М. А. Керзін.

На выстаўцы гэты перыяд у гісторыі выяўленчага мастацтва БССР будзе прадстаўлен цікавымі, выразнымі па рысунку і войстрымі па псіхалагічнай трактоўцы творамі графічнага мастацтва мастака А. М. Бразэра, бліскучымі па-майстэрству партрэтамі работы заслужанага дзеяча мастацтваў В. В. Волкава і іншымі работамі.

Што найбольш значнага створана ў выяўленчым мастацтве БССР за апошнія годы? На гэта пытанне зараз можна ўжо адказаць, спасылаючыся на закончаныя творы, створаныя мастакамі к моманту арганізацыі выстаўкі на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. У галіне жывапісу перш за ўсё неабходна адзначыць таленавітую работу мастака Е. А. Зайцава. Яго карціна «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск» яркімі фарбамі ў хвалюючых вобразах узнаўляе найвялікшую ўрачыстасць беларускага народа, які з дапамогай вялікага рускага рабочага класа разграміў і прагнаў з роднай зямлі белапалякаў.

Карціна мастака Н. А. Пашкевіча «Беларускія партызаны на прыёме ў таварыша Сталіна ў Рэўваенсовеце Заходняга фронта» бясспрэчна з'явіцца лепшым, што зроблена беларускімі мастакамі, працаваўшымі над вобразам таварыша Сталіна. Н. А. Пашкевіч—таленавіты мастак. У яго рабоце заўсёды адчуваеш страснасць і натхненне. Будучы к таму-ж выдатным майстрам кампазіцыі і жывапісцам, мастак Н. А. Пашкевіч стварыў абаяльны вобраз правадыра, чалавека, які вырошчвае і песціць народныя таленты, накіроўвае энергію і волю народа на барацьбу супроць яго ворагаў.

Вялікіх творчых поспехаў дабіўся ў сваёй карціне «Сустрэча танкістаў у Заходняй Беларусі» мастак М. І. Манасзон. Яго карціна ярка ўзнаўляе хвалюючую сустрэчу і гутарку працоўных Заходняй Беларусі з сваімі вызваліцелямі—доблеснымі воінамі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі. Гэта карціна наглядалася і перажыта мастаком у часе яго паездкі разам з наступаўшымі часцямі Чырвонай Арміі. Іменна таму адчуваеш трапяткое хваляванне непасрэднага пачуцця, сапраўднае дыханне жыцця ў тых тыповых вобразах, якія жывуць у карціне.

Малады мастак Галіна Дакальская, вядомая раней цікавым па настрою і жывапісных вартасцях пейзажам «Свіслач», выступае са сваёй першай тэматычнай карцінай «Акупанты». Гэта карціна сведчыць аб безумоўным таленце мастачкі.

Маладыя мастакі Еўгеній Ціхановіч і Ісак Давідовіч закончылі работу над некалькімі вялікімі і надзвычай цікавымі работамі. Асабліва хочацца адзначыць карціну «Беласток совецкі», напісаную імі разам. Акрамя гэтай сумеснай работы, мастакі пакажуць на выстаўцы: Ціхановіч — карціну «Выступленне Серго», Давідовіч — «Курлоўскі расстрэл». У карціне Давідовіча, можа быць, нехапае кампазіцыйнай цэласнасці і сабранасці, але яна цікавая па сваіх жывапісных вартасцях, па багаццю пачуццяў, якія хацеў выразіць мастак у гэтай рабоце.

Бясспрэчнай творчай удачай з'яўляюцца і карціны маладых мастакоў: К. Касмачова — «У падпольнай бальшэвіцкай друкарні» і А. Заборава — «Дзе сын?».

Нажаль, заслужаны дзеяч мастацтваў В. В. Волкаў не змог выставіць закончанай карціны; усё-ж яго эскіз «Гістарычнае пасяджэнне ЦК РСДРП» сведчыць аб тым, што гэта работа мастака з'явіцца безумоўным укладам у справу развіцця выяўленчага мастацтва рэспублікі.

Скульптары БССР выступаюць на гэтай выстаўцы з новымі вялікімі і значнымі творамі. Заслужаны дзеяч мастацтваў А. В. Грубэ закончыў работу над скульптурнай фігурай В. І. Леніна. Скульптар паказвае Уладзіміра Ільіча ў момант яго выступлення перад часцямі, якія накіроўваюцца на польскі фронт.

У сваёй вялікай трохметравай фігуры «Беларус», рэзанай з дрэва, скульптар змог стварыць вобраз бунтара, узнавіць у гэтым вобразе тыповыя рысы свабодалюбівага і гераічнага беларускага народа.

Заслужаны дзеяч мастацтваў З. І. Азгур выстаўляе сваю работу «Сталін». Гэта вялікая, памерам у два з паловай метры сядзячая скульптурная фігура. Скульптар вырашае партрэт Сталіна як вялікага мысліцеля — ідэолага партыі. Азгур закончыў і паказвае на выстаўцы скульптурныя партрэты народных паэтаў Янкі Купалы і Якуба Коласа, народнай артысткі Л. П. Александроўскай.

Скульптар А. М. Бразэр, які выступаў раней з войстрым па псіхалагічнасці і таленавітым па форме скульптурным партрэтам народнага артыста СССР Міхоэльса, закончыў работу над скульптурнай фігурай «Сталін — зодчы».

Малады скульптар А. Арлоў, вядомы совецкаму гледачу па яго групе «Пагранічнік і калгасніца», выстаўленай перад павільёнам БССР на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы, дабіўся вялікіх творчых дасягненняў у сваёй апошняй рабоце «Сталін і Орджанікідзе на Заходнім фронце».

У графіцы за апошні час вельмі прыкметна вырасла моладзь. Асабліва гэта сказваецца ў галіне ілюстрацыі кнігі. Тут трэба адзначыць надзвычай цікавыя работы маладога графіка Валенціна Ціхановіча. Яго ілюстрацыі да дзіцячых казак поўны выдатнага гумару, цікавы па фарбах і кампазіцыі.

Мастак Барыс Малкін, які прадстаўляе тую групу мастакоў, што прысвяцілі сваю творчасць найбольш цікаваму віду графічнай тэхнікі — афорту і асобнаму віду жывапіснага друку — манатыпіі, выступае на выстаўцы з радам цікавых, поўных настрою работ.

Мастак Ібрагім Гембіцкі прысвяціў сваю творчасць пераважна рабоце ў галіне ксілагравюры. Яго работы з серыі, прысвечанай барацьбе беларускага народа супроць белапольскіх акупантаў, сведчаць аб тым, што аўтар, бясспрэчна, валодае гэтай тэхнікай графічнага мастацтва.

Трэба спыніцца на двух выдатных мастаках-пейзажыстах, на творчай рабоце Лейтмана і Дучыца. Л. М. Лейтман—мастак-акварэліст. Яго работы вызначаюцца жывапіснай культурай і паэтычнасцю. Мастак па-майстэрску валодае цяжкай і дысцыплініруючай мастака тэхнікай акварэлі. На выстаўцы, акрамя акварэлей, ён будзе прадстаўлен пейзажам «Зіма» (масла). Гэту работу мастака можна смела аднесці да ліку найбольш цікавых работ совецкіх мастакоў у галіне пейзажа.

Мастак Дучыц выстаўляе карціну «Вялікі гідраторф» і рад невялікіх пейзажаў. Мастак ведае і любіць беларускую прыроду. Ён умее знайсці ў ёй то лірычныя, то рамантычныя рысы.

Творчыя кадры выяўленчага мастацтва БССР значна папоўніліся мастакамі заходніх абласцей нашай рэспублікі. Тут перш за ўсё трэба ўказаць на мастака Н. Рапапорта. Зроблены ім эскіз да вялікай скульптурнай групы «Вызваленне Заходняй Беларусі» сведчыць аб яго таленце і майстэрстве.

Мастакі Краеўскі, Кшэчаноўскі, Малярэвіч, Тыбер, Ландаў, Мендэльцвейг і многія іншыя ўдзельнічаюць на выстаўцы работамі, якія сведчаць аб вялікіх творчых магчымасцях іх аўтараў.

Выстаўка адлюстрыруе і багацці народнай творчасці ў галіне выяўленчага мастацтва. Выдатныя ткачы, рэзчыкі-інкрустатары, керамікі будуць прадстаўлены на выстаўцы сваімі цудоўнымі творамі.

Натхнёныя бацькоўскімі клопатамі партыі і ўрада, натхнёныя сустрэчай з вялікім правадыром народаў таварышам Сталіным мастакі, як і ўсе работнікі мастацтваў БССР, прыкладуць свае здольнасці, свае сілы і энергію к таму, каб сваім мастацтвам служыць вялікай справе партыі Леніна—Сталіна, к таму, каб праславіць сваю радзіму новымі выдатнымі творамі.

Д. ГЕНІН.



Да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. На здымку: Група старэйшых актораў, заснавальнікаў Тэатра оперы і балета БССР. Фота тэатра.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Мінск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Г—1464.